ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

1931

ЧЭРВЕНЬ

11—12

XVIII
8925

Бл 2080
Бл 1540

НА САВЕЦКІХ ПАЛЁХ—САВЕЦКІЯ ТРАКТАРЫ

ЗЬМЕСТ:

12380

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Чырвоная Беларусь

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
САВЕЦКАЯ, 59
ТЭЛ. № 17-09.

ЧЭРВЕНЬ 1931
XVIII
11-12

8925
22.0.31
ОДЕСА
12380



За прызыў ударнікаў у літаратуру



ПЛАТОН ГАЛАВАЧ

АДКАЗНЫЯ СЭКРАТАРЫ БелАППУ.

МІХАСЬ ЛЫНЬКОЎ

Бел АПП

З артыкулу Пл. ГАЛАВАЧА

ЧАС паміж першым зьездам БелАПП і другім пашыраным пленумам (12--16/V—31 г.) прайшоў пад знакам ідэолёгічнага і творчага росту беларускае пролетарскае літаратуры і пролетарскіх літаратур другіх народаў БССР. На пашыраны пленум БелАПП прышло ўжо, як вядучы атрад усяе савецкае літаратуры, як адзін з перадавых атрадаў БелАПП, як верная апора партыі на літаратурным фронце. Гэта дало пленуму магчымасьць разгорнута ставіць і пытаньні становішча пролетарскае і ўсяе савецкае літаратуры.

У якіх-жа ўмовах разьвіваецца пролетарская і савецкая літаратура сёньня? Чаго вымагае ад літаратуры дадзены этап разьвіцьця нашае краіны?—Гэта пытаньні, адказ на якія пленум павінен быў даць і даў.

БССР за час першых двух гадоў пяцігодкі зрабіла вялізарныя к окі ўперад ва ўсіх галінах і гаспадарчага і культурнага разьвіцьця. Уступілі ў строй дзесяткі новых соцыялістычных прадпрыемстваў; выканана пяцігодка па гарбарнай і папяровай прамы ловасьці БССР; больш трыццаці процантаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР аб'яднаны ў колгасах; зроблены вялізарныя дасягненьні ў справе культурна-нацыянальнага будаўніцтва. Гэтыя дасягненьні сталі магчымымі толькі дзякуючы правільнаму ажыцьцяўленьню нашай партыяй ленінскай нацполітыкі; дзякуючы няпрымірымай барацьбе партыі з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі ЎсеКП(б); дзякуючы адданай героічнай барацьбе рабочае клясы за соцыялістычнае будаўніцтва.

Дасягненьні ў справе соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР зроблены ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня. У абставінах жорсткага клясавага змаганьня адбываецца соцыялістычнае будаўніцтва і сёньня. Змаганьне ідзе на ўсіх, самых вялікіх і самых малых вучастках соцыялістычнае будоўлі. У гэтым змаганьні вырастае перамога соцыялізму.

Пролетарская літаратура—зброя ў руках пролетарыяту ў яго змаганьні за соцыялізм. Гэта ставіць перад пролетарскай літаратурай шэраг адказьнейшых задач. Трэба пасіліць ідэёвую няпрымірымасьць БелАПП'у ў змаганьні з варожымі пролетарыяту ідэолёгічнымі тэндэнцыямі, як нацыянал-дэмократызм, як пераверзеўшчына, ідэалізм. Нацыянал-дэмократызм у л таратуры разьбіты, але яшчэ далёка не дабіты цалкам. Рэцыдывы нацыянал-дэмократызму маюць і будуць мець месца і ў творчасьці і ў літаратуразнаўстве і ў далейшым. Гэта патрабуе ад БелАПП і марксыцкае крытыкі ні ў якім разе не паслабляць змаганьня з нацыянал-дэмократызмам, выкрываць яго контррэволюцыйную сутнасьць.

Надзвычайна вялікае значэньне ў нашых умовах мае змаганьне з пераверзеўшчынай. Дзякуючы цэламу шэрагу прычын, пераверзеўшчына і да гэтае пары мела магчымасьць прапаведывацца з катэдр БДз.Унівэрсытэту, не сустракаючы належнага адпору. Гэта тым большае мае значаньне, што ў нашых умовах пераверзеўшчына зьяўляецца сваявыразнай праявай вялікадзяржаўнага расійскага шовінізму. Прадстаўнікі пераверзеўшчыны ў сваёй рабоце ў БДзУ ніякай увагі не аддавалі беларускай пролетарскай і савецкай літаратуры, ігнаравалі яе. У выніку студэнты свае работы, зьвязаныя з прапрацоўкай мэтодолёгічных пытаньняў, будавалі на аналізе творчасьці амаль выключна расійскіх клясыкаў, у вельмі рэдкіх выпадках на аналізе твораў паасобных пролетарскіх расійскіх пісьменьнікаў і зусім ігнаравалі літаратуру беларускаю. Вынікам гэтага-ж зьяўляецца адсталасьць літаратурна-лінгвіністычнага аддзяленьня і асьпірантуры ад нашага літаратурнага жыцьця, якое мае месца і на сёнешні дзень, хаця ў апошнія дні некаторыя крокі ў напрамку ліквідацыі гэтага адрыву ўжо зроблены.

БелАПП, марксыцкая крытыка, правялі вялікую работу па змаганьні з нацыянал-дэмократызмам і ў галіне творчасьці і ў літаратурназнаўстве. але далёка недастатковa, яшчэ вядзецца змаганьне супроць ідэалізму, за марксыцкая-ленінскую мэтодолёгію. На барацьбу за ўладаньне ленінскай спадчынай у пытаньнях мастацтва, павінны быць мабілізаваны сілы БелАПП.

Што да змаганьня з вялікадзяржаўным расійскім шовінізмам, дык трэба адзначыць, што БелАПП не аддавала гэтаму пытаньню дастатковае ўвагі. Калі нацдэмы адмаўлялі магчымасьць разьвіцьця беларускае пролетарскае літаратуры і гаварылі пра беларускую літаратуру, як адзіна-нацыянальную, дык вялікадзяржаўныя расійскія шовіністы адмаўляюць наогул магчымасьць разьвіцьця беларускае літаратуры, у лепшым выпадку адводзяць ёй месца на задворках, як літаратуры другараднай і лічаць за нізкае для сябе займацца гэтай літаратурай; альбо абвяшчаюць ўсю беларускую літаратуру агулам нацдэмаўскай і, хаваючыся нібы за барацьбу супроць нацдэмаўшчыны, вядуць барацьбу супроць і пролетарскае і ўсяе савецкае беларускае літаратуры.

Змаганьне з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай у барацьбе партыі за ленінскую нацполітыку, у галіне літаратуры патрабуе большай увагі да гэтага пытаньня ад усіх філій БелАПП, ад кожнага белапаўца паасобку і значнай актывізацыі ў справе папулярызацыі беларускай пролетарскае і савецкае літаратуры ад профсаюзных клюбных і фабрычных бібліотэк. Кніжка беларускага пролетарскага і савецкага пісьменьніка павінна заняць належнае месца і ў нашых бібліотэках

і сярод рабочых чытачоў. Гэта ў аднолькавай меры адносіцца і да яўрэйскай і польскай літаратур.

Мы надзвычайна мала ведаем пра рэволюцыйную пролетарскую літаратуру Заходняе Беларусі, таму надзвычайна вялікае значэньне мелі выступленьні на пленуме па пытаньнях літаратуры Заходняе Беларусі. Пролетарская рэволюцыйная беларуская літаратура расьце, ня гледзячы на шалёны тэрор польскіх акупантаў, ня гледзячы на агромную дзейнасьць беларускіх нацыянал-фашыстаў Астроўскіх-Луцкевічаў. Яна ствараецца ў глыбокім падпольлі, часта ў турэмных камерах і яна, ня гледзячы на сваю, чыста формальную слабасьць, зьяўляецца моцнаю зброяй КПЗБ, рабочых і працоўнага сялянства ў іх змаганьні за сваё социялістычнае і нацыянальнае вызваленьне. Гэтую літаратуру мы павінны ведаць, павінны ведаць яе і шырокія масы працоўныя Савецкае Беларусі.

Пролетарскі пісьменьнік павінен быць актыўным удзельнікам соцыялістычнага будаўніцтва і ў першую чаргу сваёй мастацкаю творчасьцю. Гэты ўдзел будзе тым больш, чым большай будзе значымасьць творчасьці пролетарскага пісьменьніка, яе актуальнасьць, а гэта, у сваю чаргу, неадрыўна зьвязана з мастацкай якасьцю творчасьці. На сёньня мы маем у гэтым сэнсе значнае адставаньне пролетарскай літаратуры, бо адставаньне гэта значыць, што пролетарская літаратура адыгрывае недастатковую, у параўнаньні з неабходным, ролю ў клясавым змаганьні, у змаганьні за соцыялізм. Мы гэтае адставаньне перамагаем і павінны перамагчы, а гэта і значыць, што мы павінны павялічыць ролю пролетарскай літаратуры ў змаганьні за соцыялізм. Вырашэньне гэтае задачы немагчыма, калі мы ня зьвернем галоўнае ўвагі на мастацкую якасьць нашай продукцыі.

Вялізарным крокам уперад у гэтым сэнсе была разгорнутая пастаноўка на пленуме творчых пытаньняў. Пастаноўка гэтых пытаньняў паказала, што беларуская і яўрэйская пролетарскае літаратура маюць вялікія творчыя дасягненьні, што пролетарскі пісьменьнік авалодвае дыялектыка-матэрыялістычным мэтам у сваёй творчай рабоце, шэраг твораў дае нам конкрэтны прыклад больш-менш удалых спробаў рэалізацыі творчага мэтоду пролетарскай літаратуры.

Слабым вучасткам зьяўляецца тэорэтычная непадрыхтаванасьць масы белапаўцаў, авалоданьне матэрыялістычным сьветапоглядам. Ад пасьпяховага вырашэньня гэтае задачы залежыць і ліквідацыя адставаньня.

У справе ліквідацыі адставаньня для пролетарскай літаратуры асабліва вялікае значэньне мае арабочваньне організацыі, заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру. БелАПП на сёньня яшчэ толькі распачынае гэтую працу, яна яшчэ ўперадзе. На выкананьне гэтай задачы павінны быць мобілізаваны ўсе нашыя сілы. У гэтай справе БелАПП патрэбна вялікая і сыстэматычная дапамога з боку комсамольскіх і профсаюзных організацый. Трэба сказаць, што і профсаюз і комсамол асабліва пытаньням пролетарскага руху належнае ўвагі не аддавалі. Перанесьці сюды цэнтр увагі, стварыць пролетарскую літаратурную грамадзкасьць, шырокі масавы рабочы літаратурны рух,—вось галоўная наша задача.

Пролетарская літаратура ў твары БелАПП'у—гэта баявая пролетарская організацыя. Творчасьць пролетарскага пісьменьніка павінна быць баявой зброяй соцыялістычнага пазнаваньня і перапрабкі сьвету. Над справай соцыялістычнай перапрабкі нашай краіны працуюць сотні тысяч рабочых і колгасьнікаў, працуюць тысячы лепшых рабочых ударнікаў і ўдарнікаў колгасных палёў. Краіна павінна ведаць сваіх герояў і вопыт работы гэтых лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы. Паказаць іх і іхную работу самым шырокім масам працоўных—гэта чарговая баявая задача пролетарскае літаратуры. Пленум БелАПП'у абвясьціў сябе мобілізаваным на выкананьне задачы мастацкага паказу пяцігодкі і паставіў гэтую задачу перад усёй Асоцыяцыяй. Вырашэньне гэтай задачы зьяўляецца баявой праверкай для БелАПП'у і з гэтага пункту гледжаньня павінна правярацца яе выкананьне.

У справе змаганьня за пролетарскую літаратуру вялізарнае значэньне мае сталінскі лёзунг „Тварам да тэхнікі". Гэты лёзунг ёсьць лёзунгам і пролетарскай літаратуры. Тэхнічная няпісьменнасьць пісьменьнікаў зьяўляецца сур'ёзнай перашкодай у сэнсе як мастацкага ахапленьня рачаіснасьці ва ўсіх яе праявах, так і ў зразуменьні новага этапу рэволюцыі ва ўсёй яго паўнаце. Аўладаньне неабходным мінімумам тэхнічных ведаў; сувязь пісьменьніцкіх аб'яднаньняў з навукова-тэхнічнымі ўстановамі; мастацкая популярызацыя тэхнічных ведаў,—вось некаторыя з мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні гэтага лёзунгу.

Сярод спадарожнікаў за гэты час (пасьля зьезду БелАПП'у) адбылася рэзкая дыфэрэнцыяцыя. Некаторыя з іх цалкам перайшлі ў лягер контррэволюцыйнага нацыянал-дэмократызму; большасьць, наадварот, імкнецца наблізіцца да пролетарскай літаратуры, да аўладаньня пролетарскіх сьветапоглядаў, тым самым імкнецца стаць саюзьнікам пролетарыяту. Наша задача ўсяляк дапамагаць гэтаму набліжэньню: таварыская дапамога, пасьлядоўная таварыская крытыка недахопаў і памылак спадарожнікаў і самая бязьлітасная барацьба супроць усялякіх праяў нацдэмаўскае і буржуазнае ідэолёгіі, — гэтым павінны адзначацца нашыя адносіны да спадарожнікаў. Умець адрозьніваць саюзьніка ад ворага, дапамагчы таму, хто шчыра імкнецца працаваць з намі, біцца за кожную жывую адзінку, каб пасабіць тым з падарожнікаў, хто яшчэ ня цалкам вызваліўся з-пад уплыву нацдэмаўшчыны, вызваліцца ад гэтых уплываў. Трэба памятаць, што набліжэньне спадарожнікаў да пролетарскае літаратуры,—гэта ёсьць адыход іх ад позыцый „нэўтральнасьці", „пасыўнасьці" і набліжэньне іх да позыцыі пролетарыяту, а не адступленьне ад гэтых, пролетарскіх позыцый БелАПП. Той, хто гэтага яшчэ не разумее, хто думае сваё набліжэньне да позыцый пролетарыяту купіць адыходам БелАПП'у ад гэтых позыцый, той рызыкуе папасьці ў лягер буржуазнае літаратуры.

БелАПП сёньня зьяўляецца ідэёва вядучым атрадам усяе савецкае літаратуры. Да свайго пашыранага пленуму БелАПП прышло з вялікімі ідэёвымі і творчымі дасягненьнямі. Гэтыя дасягненьні сталі магчымымі толькі таму, што БелАПП усю сваю работу праводзіла пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі; у сувязі з шырокімі масамі працоўных; у абставінах барацьбы з беларускім нацыянал-дэмократызмам і шовінізмамі другіх відаў; у абставінах барацьбы супроць правае небясьпекі—„лявацкіх" загібаў, за бальшавізацыю пролетарскага літаратурнага руху. Гэтыя ўмовы будуць і закладам далейшых, яшчэ большых перамог пролетарскае літаратуры. БелАПП павінна быць і будзе перадавым бальшавіцкім атрадам беларускае савецкае літаратуры.

Васіль Каваль і Сымон Баранавых у часе пленуму.

Поэзія БелАПП'у на пераломе

Артыкул М. Аляхновіча

Міхась Чарот.

Андр. Александровіч.

Ізі Харык.

На сёнешні дзень нельга сказаць аб паэзіі БелАПП, як аб нечым адзіным, суцэльным. Поруч з асноўным ядром пролетарскіх поэтаў мы маем некаторую частку поэтаў пролетарска-колгасных і параўнальна значную групу унутраных спадарожнікаў, якія ў пэўнай сваёй частцы імкнуцца перайсьці на рэйкі пролетарскай поэзіі.

Міхась Чарот (пакуль не ўваходзіць у БелАПП) зьяўляецца адным з пачынальнікаў нашай пролетарскай поэзіі. Ужо сваёй першай поэмай „Босыя на вогнішчы" ён зрабіў буйны ўклад у нашу маладую поэзію. Яго творчасьць цалкам сугучна з ідэямі Кастрычніка. Зборнікі вершаў „Завіруха" і „Сонечны паход" паказваюць нам поэту не староньнім наглядчыкам рэволюцыйнай завірухі, а яе непасрэдным актыўным удзельнікам.

Адчуваньнем нашага жыцьця, мастацкім адбіцьцём процэсаў барацьбы пролетарыяту Беларусі, моцнай верай у лепшую будучыню, за якую мы змагаемся, поўняцца радкі поэты. Апошнія гады мы бачым новы творчы ўздым Чарота, які даў цэлы шэраг твораў, у якіх ён паказвае паасобныя моманты нашай эпохі, паказвае, як нараджаецца новы чалавек, як у процэсе клясавай барацьбы аформляюцца расткі новага соцыялістычнага побыту.

Поэт выступае супроць тых, хто перашкаджае нашаму творчаму росту. Выступленьне купкі нацыянал-дэмократычнай інтэлігенцыі, якая вяла шкодніцкую політыку, якая імкнулася шляхам інтэрвэнцыі зьнішчыць дыктатуру пролетарыяту, вызвала баявы адпор з яго боку. („Суровы прыгавар падпісваю першым").

— Чарот бязумоўна, зьяўляецца адным з лепшых пролетарскіх поэтаў нашай сучаснасьці.

Але трэба ўсё-ж зазначыць, што яго творчасьць апошняга кругабегу паказвае толькі паасобныя моманты, якія яшчэ не даюць шырокага малюнку сучаснасьці. Мы наглядаем процэс творчай перабудовы поэты адпаведна задачам рэконструкцыйнага пэрыоду. Будзем спадзявацца, што вялізныя творчыя магчымасьці Чарота змогуць шырока разгарнуцца і што ён зможа даць новыя творы, якія будуць адпавядаць нашай эпосе так, як калісьці адпавядала свайму часу ягоная поэма „Босыя на вогнішчы".

У творчасьці Андрэя Александровіча асноўнае месца займае адбіцьцё процэса соцыялістычнага будаўніцтва ў горадзе. Новы горад, работа рабочых, саматужнікаў, барацьба пролетарыяту за новую індустрыяльна-колгасную Беларусь, соцыяльныя і інтэрнацыянальныя мотывы, мотывы лучнасьці працоўных розных нацыянальнасьцяй—знаходзяць пачэснае месца ў яго творчасьці. Поэт, не адступаючы ні на крок, ідзе нага ў нагу з жыцьцём.

У вершаваным рамане „Нараджэньне чалавека" (друкам ня скончаны) ён спрабуе паказаць процэс нараджэньня новага чалавека, процэс формаваньня пролетарскай ідэолёгіі ў жанчыны ва ўмовах дыктатуры пролетарыяту.

Поэма „Цені на сонцы" новы значны крок на творчым шляху поэты. У ёй ён выводзіць цэлую галерэю шкоднікаў, асоб, якія, карыстаючыся „савецкім дабрадушшам", прымазаліся да нашага ладу, каб лепш шкодзіць. Для нас важна політычная актуальнасьць поэмы, пачуцьцё клясавай ненавісьці да тых, хто змагаецца супроць справы пролетарыяту. Аўтар тут паказвае конкрэтных носьбітаў зла, ён ускрывае іх клясавую сутнасьць, Паказвае іх, як цёмныя цені на сьветлым сонцы нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

Ня толькі ў „Ценях на сонцы", але і ў шэрагу вершаў, як „Міністр", „Крыўда", „Аукцыён", „Поэма пра ворага" і інш. Александровіч сьмела зрывае маскі з нацыянал-дэмократаў мастацка-ўпэўніваюча паказвае твар агентаў інтэрвэнцыі.

— Продукцыя апошніх год, якая сабрана ў зборніках „Угрунь", „Устаноўка", „Гудкі", „Фабрыка сьмерці" паказвае на шырокае кола тэм, якое ахапляе аўтар, на тое, што Александровіч тэматычна перабудаваў сваю творчасьць, адпаведна задачам сучаснасьці.

Аднак пераважна разважлівы падыход да творчасьці зьніжае соцыяльна-значную тэматыку. Александровіч добра ведае тое, аб чым ён піша. Але гэтыя веды адарваны ў яго ад сьветаадчуваньня, таму што ён элемэнты сьветаадчуваньня адсоўвае ад сваёй поэзіі. Разрыў паміж думкай і словам, паміж асноўным апасрэднічаньнем і непасрэдным успрыняцьцем сусьвету трэба яму перамагчы.

Пятрусь Броўка высунуўся ў нашай поэзіі за апошнія гады. У сваёй раньняй поэме „Рапорт" ён рапартаваў пролетарскай грамадзкасьці аб цэлым шэрагу шкодных і хваравітых зьявішчаў у нашым літаратурным жыцьці. Яго творы апошніх год ставяць самыя баявыя тэмы сучаснасьці. У адным з сваіх лепшых вершаў „Гады як шторм" ён на фоне сьмерці Леніна паказвае асноўныя моманты змаганьня пролетарыяту за новае жыцьцё. Паказвае глыбока і эмоцыянальна-ўпэўніваюча.

Броўка ўмее ўвязваць актуальнасьць сваёй тэматыкі з глыбокім адыходам да жыцьця, асэнсіць гэтыя зьявы жыцьця ня толькі паасобку, але і ў іх комплексе.

Але трэба зазначыць, што схэматызм у падачы зьяў жыцьця ім яшчэ канчаткова не пераможаны („Прамова фактамі"). Праўда, такія творы, як „Цэхавыя будні", аповесьць „Каландры" паказваюць процэс перамаганьня, але гэты процэс яшчэ ня скончаны.

Броўку трэба ня толькі перамагчы павярховасьць і схэматызм, якія яшчэ ёсьць у яго—яму трэба многа і ўпарта вучыцца, каб даць пролетарскай літаратуры высокакаштоўныя творы.

Мікола Хведаровіч сваёй першай кніжкай „Настроі" вызваў вострыя нападкі часткі нашай крытыкі. І зразумела чаму. Непераможныя рэшткі дробна-буржуазнай ідэолёгіі яшчэ моцна сказаліся ў гэтым зборніку. Апошнія часы поэта спрабуе творча перабудавацца, прабуе наблізіцца да пролетарскай поэзіі (новая тэматыка, соцыяльная насычанасьць, актыўнасьць). Але гэта набліжэньне да пролетарскай поэзіі ідзе не па шляху глыбокага апанаваньня дыялектыка-матэрыялістычным мэтодам, а па шляху перанясеньня на беларускую глебу элемэнтаў падфарбаванага конструктывізму.

Марксыцкая крытыка ясна даказала, што шлях конструктывізму не зьяўляецца шляхам пролетарскай поэзіі. Яна ўскрыла рэакцыйныя элемэнты ў іх дэклярацыі і творчасьці.

Таму зразумела, што захапленьне конструктывізмам не дапамагае Хведаровічу ў яго творчай перабудове.

Творчасьць часткі поэтаў унутраных папутнікаў характарызуецца арганічнай рэволюцыйнай шчырасьцю, жаданьнем паглыбіцца ў тэму, уцёкамі ад таннага стандарту. Але яшчэ не пераможаны канчаткова—пасыўнасьць, кніжнасьць, эстэтства. Яшчэ няма ў іх творах сапраўднай узрушанасьці. Праўда, поэты ўзрушаны самімі сабой, сваімі нядолямі і радасьцямі. Але таму, што гэтыя нядолі і радасьці малазначныі, ва ўсякім выпадку, пазбаўлены шырокага соцыяльнага зьместу, то чытачу ад іх ня цёпла і ня холадна.

Ча та вершы на рэволюцыйныя тэмы поэтаў-спадарожнікаў правільны. Яны спрабуюць зваць і організоўваць чытача. Але яны, як нядобраякасная продукцыя нашых заводаў, знашваюцца хутка. Ды і ня быць інакш. Бо доўга жыве тое мастацтва, якое ўтвараецца ў выніку глыбокага прадумваньня і „вчувствованя“ ў атуляючую рэчаіснасьць, у выніку непадрыўнай сувязі поэты з перадавымі ідэямі свайго часу.

Для адных мінулыя гады былі гадамі блуканьняў (Маракоў, Звонак). Другія тварышы прышлі ў поэзію бяз значнага жыцьцёвага вопыту, без рэволюцыйнага гарту. Яны прышлі ў нашу організацыю ў маладым узьросце з дробнабуржуазнага асяродзьдзя, ня нюхаўшы пораху клясавых боек, і гэта паклала адбітак на іх творчасьць (Таубін, Куляшоў, Астапенка).

Алесь Звонак сваёй першай кніжкай „Буры ў граніце“ аддаў даніву дробнабуржуазнай ідэолёгіі. У поэмах „Каршун“ і „Трэцяя поэма“ ён паспрабаваў, выкарыстоўваючы тэматыку грамадзянскай вайны, даць творы, сугучныя пролетарскай поэзіі. Але павярховы падыход да тэмы, сваяасаблівы экзотызм, захапленьне романтыкай, пры ўсім суб'ектыўным жаданьні поэты не змагло паказаць значнага зруху аўтара.

Але гэта перабудова пакуль ідзе па лініі павярхоўнага паказу нашае эпохі. Характарным зьяўляецца верш „Крокі эпохі“, дзе аўтар, абмежаваўшыся гучнымі словамі, зусім не паказвае ўнутраных процэсаў, якія адбываюцца ў жыцьці.

Творчасьць Валерыя Маракова характарызуецца набліжэньнем да нашай сучаснасьці, але поэт да гэтага прышоў віхлястым шляхам.

Ад яго першага зборніка „Пялёсткі“ (1926) вее сумам і ўпадніцтвам. Вершы прасякнуты сантымэнтальна-мэлянхолічным настроем... Убачыўшы горад ён адвярнуўся ад яго, ня ў марах, а ў рэчаіснасьці, адпіваючы няўхільнасьць руйнаваньня старога патрыярхальнага жыцьця. Ад гарадзкой культуры ён імкнецца на ўлоньне прыроды.

У наступным зборніку „На залатым пакосе“ (1927 г.) ён спрабуе адыйсьці ад ранейшых настрояў. Праўда, на жыцьцё ён глядзіць здалёк і ўспрымае яго павярхова—толькі вонкавы бок. Адсутнасьць шырокага сьветапогляду прыводзіць да таго, што глыбокія ўнутраныя процэсы жыцьця застаюцца па-за яго ўвагай. Як працяг эгоцэнтрызму раньніх вершаў, мае месца поза, любаваньне сабой.

Апошняя кніжка „Вяршыні жаданьняў“ (1930 г.) паказвае больш значнае набліжэньне да сучаснасьці. Ён пачынае ўспрыймаць процэсы жыцьця не як староньні наглядач, а як непасрэдны ўдзельнік. Ён спрабуе ў свае творы прынесьці рэволюцыйнасьць. Але трэба зазначыць, што гэты зрух у бок новага яшчэ носіць характар стыхійнасьці, а не пранікненьня ў глыбіню зьяў.

Калі яго ранейшыя вершы былі поўна глыбокага лірызму, непасрэднасьці, фарбнасьці, дык новыя творы, якія паказваюць шлях набліжэньня Маракова да пролетарскай літаратуры, яму яшчэ цалкам не ўдаюцца. У вершы „Адтуль, дзе палыхаюць домны“ і інш. ён падае толькі вонкавасьць зьяў, не прасякаючы ў іх глыбіню.

Для групы поэтаў Таўбін, Куляшоў, Астапенка, якія імкнуцца наблізіцца да пролетарыяту сваёй творчасьцю, асноўным зьяўляецца тое, што яны падыходзяць да нашай сучаснасьці не як непасрэдныя ўдзельнікі, а як староньнія гледачы. Іх пачуцьці, іх тэмы, іх гэсты, іх подбор слоў разьлічаны на некаторы эфэкт, якія не выплывае з іх сутнасьці.

Небходна констатаваць адставаньне іх поэзіі ад задач рэконструкцыйнага пэрыоду.

Для Таўбіна яшчэ характар алюбаваньне словам дзеля слова, концэнтрацыя тэматыкі вакол свайго „Я“.

Апошняя поэма Куляшова „Крыўда“ зьяўляецца характарным прыкладам спадарожніцкай поэзіі. У гэтым творы падаецца імпэрыялістычная і грамадзянская вайна. Але замест ускрыцьця законамернасьці пераходу вайны імпэрыялістычнай у вайну грамадзянскую, аўтар, недастаткова разумеючы рухаючыя сілы нашай пролетарскай рэволюцыі, выказвае „крыўду“ супроць усякай вайны, сваяасаблівы пацыфізм.

Апошнія гады даюць значны рост новых поэтычных кадраў. З літстаронак і дадаткаў газэт яны пераходзяць на старонкі нашых таўстых часопісаў.

Некаторыя з іх ужо сёньня становяцца значнымі пролетарскімі пісьменьнікамі (Зарэцкі).

Але пры ўсёй соцыяльнай насычанасьці і актуальнасьці іх тэматыкі (Ракіта, Віталін, Ушакоў, Агняцьвет, Курбацкі, Хадкевіч, Пруднікаў, Алесін, Маёвы ды інш., трэба зазначыць слабое апанаваньне дыялектыка-матэрыялістычным мэтодам, слабую мастацкую апрацоўку твораў.

Матэрыялістычная дыялектыка ў прыстасаваньні да пролетарскай поэзіі ранейза ўсё мяркуе пасьлядоўна-матэрыялістычны падыход да ўсіх зьяў сусьвету. Ня толькі ўся злучнасьць мастацкіх прыёмаў павінна быць матэрыялістычна, матэрыялістычным павінен быць і сам падыход да матэрыялу. Кожны твор павінен дапамагаць пазнаньню сусьвету, у процэсе клясавай практыкі зьмяняць яго. Мы павінны падкрэсьліць дзейсную рэволюцыйную ролю поэзіі. Матэрыялістычна - дыялектычны мэтод імкнецца ня толькі да пазнаньня сусьвету, але і да яго зьмены. Адгэтуль асаблівую цікавасьць для пролетарскага поэты набывае паказ жыцьця ў яго станаўленьні, у барацьбе пачаткаў прогрэсыўных і рэакцыйных, учора і заўтра. Адгэтуль імкненьне ўвесьці чытача ў гэтую барацьбу, як актыўна дзейную асобу, даць творчую зарадку, быць, прыкладам для перайманьня, якое актыўна ўмешваецца ў жыцьцё і зьмяняе твар сусьвету.

Неабходна, каб кожны поэта ясна ўсьвядоміў тыя запатрабаваньні, якія прад'яўляе яму жыцьцё. Неабходна падвышэньне агульнага культурнага ўзроўню поэтаў. Неабходна прывучыцца самастойна мысьліць і політычна, і філёзофскі, і мастацкі; упарта змагацца за апанаваньне дыялектыка-матэрыялістычным мэтодам работы над словам—вось умовы, пры наяўнасьці якіх наша поэзія зможа выйсьці на шырокую дарогу.

„Адзем'яніваньне“ нашай поэзіі, заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру, рост новых поэтычных кадраў з шэрагаў пролетарыяту дапаможа хутчэйшай перабудове нашай поэзіі адпаведна задачам рэконструкцыйнага пэрыоду.

Валеры Маракоў.

Пятрусь Броўка.

Алесь Звонак.

РАБКОРЫ-ЎДАРНІКІ

Нарыс
ЮРКІ БІТУСА

Пачалося яно са сьлясарнага цэху.

Імчаліся дні. Шлёгалі гучна пасы па шківах, круціліся шасьцяронкі варштатаў „Сэсі-азі", беглі.

Міналася дэкады, месяцы, квадры. Яшчэ некалькі дзён і будзе палова 3-га рашаючага, яшчэ некалькі дэкад—і ўся пяцігодка. Вось на доле ляжаць валікі, прыгожа адточаныя шрубы, шасьцярні. Стаяць, бы шклянкі, чырвоныя цыліндры помпаў, круглыя дугі кувыркоў. Малымі бранявікамі паўзуць на вазках камнядрабілкі. Грукочуць, плывуць туды, дзе віднеецца шырокі двор, горад, нарэшце ўся краіна, дзе вечна стаяць з барадатымі нагамі ламавікі і чакаюць загаду свайго гаспадара, куды-б завесьці груз.

— Гр-р-р,—цяжка грукочуць колы.

— Ці-і-гі-і,— скрыгочуць, пішчаць, бы гвалтоўна зьвязаныя і пакладзеныя на воз машыны.

А краіне столькі патрэбна іх—дробных, грамоздкіх і зубастых, якія-б падобна арэхам трускалі каменьне, падымалі руду, капалі штольны, тунэлі.

Праходзілі дэкады, месяцы, квадры.

Сьлясарны цэх апошнім прыкладаў свае сілы да кожнае дэталі. Быў сьведкаю колькасьці і якасьці выпускаемай продукцыі, ведаў запал кожнага другога цэху.

Па касым схіле неба дзень павольна каціўся да захаду. Выбухнуў прарэзьлівы, магутны гук.

— Гу-у-у да-мо-ў!—апавяшчала сырэна. На дварэ бегатня і шум.

— У чым справа?—пыталіся некаторыя.

— У тым... На сход трэба.

Блакітны туман дыму хутка напоўніў рабочы клюб, здавалася столь хацеў узадраць, выкарабкацца на прастор. Жывая гамонка паміж рабочымі пераліваласа на розныя тоны, падобна машыннай, была выразнаю, рытмічнай.

У бліскучай ад мазі куртцы, з мэтрам у левай кішэні, рухавы майстар сьлясарнага цэху тав. Гобэрман дакладваў сходу аб тым, што дэкадны плян недавыканаһы, што другія цэхі несвоечасова падаюць паўфабрыкаты, што і яны адстаюць.

Выказваў вялікае незадавальненьне супроць браку, глуму.

— 24 гады працую на вытворчасьці, кожнаму вядома... А ці перараблялі пасьля мяне.

Шуршэлі па паперы алоўкі, вязаліся доўгія ланцужкі слоў, сказаў. Бы тоўстыя і крутыя рогі бралі рабкоры-ўдарнікі факты (у сьлесарным цэху—кожны ўдарнік—рабкор), вадзіліся з імі, дужаліся. А яны ўпартыя хадзілі ўсьлед, паступалі на ногі, гарэзьліва крывілі свае твары, сьмяяліся.

— Дзе корань перашкод?

І словы майстра Гобэрмана „недавыканалі", „зьнізілі тэмпы" ганебна насіліся ў паветры, круціліся гульлівымі маленькімі стварэньнямі і чапляліся на правады, адарваныя лёзунгі кулдыкаліся на падлозе.

Кожнаму хацелася злавіць хоць адно гэта назойлівае, гульлівае, прыціснуць падноскам, каб зрабіць нярухомым, няжывучым.

Заслухаўшы інформацыю аб становішчы выкананьня пляну, па ўсім заводзе рабкоры—Пісьман, Бэльдман, Казіла, Дрыжэр і іншыя зараз рашылі пагаварыць асобна.

Пасьля сходу яны вопрамецьцю кінуліся ў другі пакой. Сабраліся. Пакуль Пісьман (ён адказны рэдактар шматтыражкі „Комунаравец") капаўся ў папцы, хлопцы жартавалі:

— Юзік, што ў цябе за поясам?

Той паглядзеў, а калі злавіў рукою нейкі доўгі матуз, нарочна некім прычэплены, гучна разам з усімі засьмяяўся.

— Ой, глядзеце! гэта работа Вадзі.

— Таварышы!—нарэшце пачынаў Пісьман,— усё зразумела. Нам рабкорам раней за іншых трэба ўзяцца за ліквідацыю прарыву. Як? Складзем сквазныя. Былі ды распаліся—недапушчальна. Кожнага зрыўшчыка сюды. Ведаеце! Тэмпы! Плянаў рушыць нельга. Ні на капейку, ні на вінцік. Ну?

Праз адчыненыя вокны малога пакою павяваў мяккі вецер. А калі адчыняліся дзьверы, тады вецер узмацняўся, у пакоі падымалася вялікая бура. Ляцелі са стала паперы, надзімаліся ад сьцен плякаты, рабіліся круглымі, пукатымі.

— Іначай нельга. Рынемся...—вышла апошнім слова з пакою...

Конвэер цэхаў зноў на поўным ходу. Энтузіязмам маладых ахоплены ўвесь завод...

Запрацавалі сквазныя, стварылыся шэраг ударных рабкораўскіх брыгад імя Усебеларускага зьезду рабкораў.

Ой яблычка-а
Ды куды ко-о-ці-сь-ся-а ды...

Чулася ў часе працы ў сьлесарным.

— За пераходны! Хлопцы! А давай падымем такую ідэю. Узяць!

За граніцу пападзе-еш
Не вароцісь-а-а!

— Эх дзівакі! Вось разам гэта ўзялі-б. Напружана так, ну і ўзялі-б.

Прайшла дэкада. Зноў аклікала ваколіцу сырэна, толькі ня трывогай, ня жалем.

НА РАСЬЦЯРОБЕ

Верш
СЯРГЕЯ АСТРЭЙКІ.

Асмолкі зары на далёкім кургане.
Бялеюць абрысы Птушыных Дарог.
Туману адбрэнгалі пудкія здані,
І сонца угору ўзьнялося на корх.

Ў гушчарах туляецца навалач змроку,
Цьвірчыць пасьля ночы трухлявы шыльнік.
І эха сланяецца лесам далёка;
Мажныя зрываюцца з кораня пні.

Сухія наўкола ляцяць аскабалкі,
Дашчэнту пастрэмлена імі зямля.
Дрыжыць загамованым шумам прагалак,
І хвоі высокія гольлем смыляць.

Руплівая праца брыгад дрывасекаў
Краіне рыхтуе дрыўяны сырэц.
Смалы надарылі хваіны на лекі,
Піла іх зубамі за ногі бярэ.

Гібляюцца рукі навошчаных елак,
Падаюца наперад наровяць яны.
Ўспадае на гольле патрушчаны нелад,
Ўядаюцца ў зямлю глыбока ражны.

Ім рукі абсекаюць вострай сякерай,
Сьцінаюць галовы, зьдзіраюць кару...
Бягуць працяробы ў баровую шэрасьць.
Сьвіцiцца здалёку асмуглены рум.

Ўтуліўшы галовы ў мурашнікі лесу,
Ашчэрылі зубы збуцьвелыя пні.
Вырастаюць гурмы шліпёраў, ачэсу.
Бярвеньне, як крохкая шклянка, зьвініць.

Пазырыўшы змору на дробныя шматы,
Сякуць дрывасекі, ня чуючы рук.
Агортвае ў лесе іх вечар крылаты,
А раніцай з неба праводзяць зару...

Па рэчцы ідуць параходы няс ынна.
Як вокам акінуць зіяюць плыты:
Адвозяць бярвеньне заводам краіны,
Плывуць і плывуць паўз алешнік густы

Нязломныя сілы у працы дазваньня
Фабрычнай краіне ня шкода аддаць...
Сякеры у лесе зьвіняць ад сьвітаньня,
За логам цьвіце кашміровая даль.

29/V—31 г.

Вартуйце свой чырвоны сьцяг!

ЗАЎТРАШНЯЯ ВАЙНА

Нарыс

Л. КЛІМЧУКА

— У бой за апошнюю вайну!—крычалі буржуазныя пісакі са шпальтаў шматмільённых газэт у жніvеньскія дні 1914 году. У імя гэтае апошняе вайны імпэрыялісты забілі 13 мільёнаў чалавек на шматлікіх франтох сусьветнай вайны. У імя гэтае апошняе вайны былі паранены і скалечаны мільёны юнакоў, дзяцей, старых, мужчын і жанчын для таго, каб на заўтра пасьля апошняе вайны пачаць ліхаманкавую падрыхтоўку да новае, яшчэ больш крывавае вайны.

Помніце жудасны малюнак, апісаны нямецкім пролетарскім пісьменьнікам Іоган Бэхэрам у яго кнізе „Люізіт":

... Па асфальтавых вуліцах гораду гудзе чырвоны гураган чалавечых мас.

Вось маршыруе, памалу і ўсё зноў спатыкаючыся процэсія ахвяр вайны: некаторых нясуць на насілках, большасьць кульгае стомлена наперад на монотонна скрыпучых кастылёх, вось аддзяленьне асьлепленых, вось бязрукія, вось бязногія, вось тыя, у якіх захавалася толькі адно тулава. Тут нясуць плякаты: „Мы абяцалла вайны", або „Вайна вайне", або: „Пролетары, памятайце на імпэрыялістычную вайну".

Бяз музыкі маршыруе процэсія.

На чале шкілет з лічбамі: „13 мільёнаў".

...та вынік капіталістычнай сыстэмы, якая, зараз рыхтуецца ...ае сусьветнае бойні. Рыхтуюцца ўсе. Рыхтуецца Амэ... ...хтуецца Англія, Францыя, Германія, Італія, Японія...

Пад заслоны хмары пацыфісцкіх конгрэсаў, зьездаў, конфэрэнцый рыхтуецца новая разаніна. І трэба прызнаць, што ў с...аборніцтве балбатні аднosна міру народаў усіх пераганяе мілітарыстычная Францыя, якая, праўда, хацела-б мірным парадкам праглынуць ня толькі Германію, але і добрую палавіну дзяржаў сухазем'я і колёній. Лепш і больш удала, чымся іншыя дзяржавы, Францыя добра ажыцьцяўляе заяву Мусоліні, што добрыя словы,—добрая справа, але добрыя кулямёты,—яшчэ лепш.

Мы хочам разам з мастацкім пропагандыстам францускага імпэрыялізму Стэфанам Лёзанам павандраваць па прымежных слупох, горах, лагчынах, нізінах, якія аддзяляюць Францыю ад яе суседзяў, для таго, каб паглядзець, як старанна, як упарта і ўдзень і ўначы працуе Францыя над падрыхтоўкай новай, яшчэ больш крывавай, яшчэ больш жудаснай вайны.

У добрым аўтомобілі генэральнага штабу разьяжджае Лёзан уздоўж франка-нямецка-італьлянскай мяжы, ён падымаецца на сьцежкі Альпаў, што аддзяляюць Францыю ад Італіі. І ўсё гэта для таго, каб паказаць нам, што сама Францыя ня дасьць ламанага граша за ўсе размовы аб разбраеньні. Стэфан Лёзан з высокіх Альпійскіх гор гаворыць усяму сьвету: „балбатайце шаноўныя панове аб разбраеньні, колькі вам уздумаецца. Францыя—ня дурніца, усур'ёз ніхто вашыя прамовы ня прыме"...

Стэфан Лёзан друкаваў свае ўражаньні ў парыскай газэце „Матэн". Скарыстаем асобныя мясьціны з яго нарысаў, каб і нам хоць крыху ведаць пра тое, „як Францыя сёньня абараняецца".

* * *

...На выгіне вузкай лагчыны раптам паказваюцца рыштаваньні вялізарнай будоўлі, што раскінулася на сотні мэтраў вакол. Яны маскіруюць работы, якія праводзяцца ў глыб зямлі. Груды рознага роду матэрыялаў. Ваганеткі бегаюць на рэйках. Электрычныя ліхтары падымаюць высока ў паветра свае шары.

— Які завод будуецца тут?—пытаюся свайго праваднік.

Праваднік ухмыляецца.

— Гэта не завод,—адказвае ён,—гэта звычайны казэмат. Мы на абарончай лініі...

Мы ўжо ведаем, што казэмат, гэта тэрмін усякага абароненага ад варожага агню памяшканьня, у якім знаходзяцца агнявыя сродкі барацьбы, якімі з казэмату страляюць па праціўніку, тут-жа хаваюцца і людзі ад агню ворага. І ўздоўж усяе трохсоткілёмэтравае мяжы Францыя будуе гэткага роду казэматы. Такі казэмат будзе памерам ня больш дзесяці мэтраў і зможа захоўваць усяго толькі тузіну людзей і пару кулямётаў. Аднак каб пабудаваць гэты казэмат, трэба вынуць дзесяць тысяч кубічных мэтраў зямлі і працаваць вельмі ўпарта на працягу шасьці месяцаў. Наведаем яго.

...Перад намі бэтонны блёкгаўз. Гэта—баявая пабудова, прыстасаваная і ўзброеная для самастойнай кругавой абароны, абсталяваная ўсім патрэбным для жыцьця невялікага гарнізону. Але я ня ведаю кудой зайсьці ў гэты блёкгаўз? Да яго вядзе сьцежка, схаваная на ўзгорку. Вузкая шчыліна дазваляе пралазіць у сярэдзіну блёкгаўзу. Прайшоўшы туды, апынешся ў квадратовым памяшканьні з мэталічнымі сьценкамі, прабітымі толькі дзьвюма вузкімі адтулінамі, кудой праходзіць сьвятло і паветра. Праз гэтыя адтуліны пройдуць рулі кулямётаў. Гэтае памяшканьне крыху нагадвае каморку бранявой башні ваеннага карабля.

У сярэдзіне па баках невялікія рэдуты, якія абараняе атрад у межах 1 роты—1 батальёну з артылерыяй. Адзін вядзе лесьвіцай да купалу, які будзе роўны ўзроўню зямлі, як пэрыскоп падводнай лодкі раўняецца ўзроўню мора. Там змогуць трымацца два чалавекі—наглядач і кулямётчык, які будзе абараняць падыход да казэмата. На гэты раз падумалі аб усім, нават аб тым, аб чым ня думалі будаўнікі ранейшых магутных фортаў.

Баец, калі ён замкнёны ў бэтонным блёкгаўзе, дык ад яго вымагаецца ўменьне страляць ня толькі на далёкую адлегласьць, але і на блізкую. Хіба ў часе сусьветнае вайны гарнізон вялізарнага форта Во ня страціў усякую баяздольнасьць, калі праціўнік узьлез на вышэйшую частку ўзмацаваньняў? Другі рэдут вядзе лесьвіцай у ніжэйшае памяшканьне тых самых памераў, што і вышэйшае, але без адтулін. Там разьмесьцяцца і, калі гэта патрэбна будзе, улягуцца спаць людзі, не занятыя наглядаваньнем за стралянінай. Такім чынам кожны казэмат складаецца з двух паверхаў і купалу.

— Усё прадугледжана,— сказаў мой праваднік.—Там будуць уборныя, вада, электрычнасьць, тэлефон, паходныя ложкі. Усё, што можа даць ня толькі бясьпечнасьць, але і раскошу дванаццаці чалавекам, замкнёным у дзесяцімэтравай скрынцы—яны будуць мець.

Гэты казэмат з жалеза і бэтону, абаронены ад разрыўных набояў буйных гармат, ня больш падобны на нікчэмныя казэматы траншэй апошняй вайны, чым сучасны лінейны карабель брытанскага адміралцейства на драўляны фрэгат часоў адміралу Нэльсону.

* * *

Ранейшая абарона Францыі грунтавалася на сыстэме цытадэляў. Вэрдэн, Туль і інш. былі далёка ад мяжы і фактычна маглі затрымліваць ворага, калі ён ужо гуляў на значнай тэрыторыі дзяржавы. Зараз Францыя ствярае, як кажа Лёзан, свой „ланцуг абароны" бліжка самае мяжы. Прасачыўшы на мапе ад Люксэнбургу да Базэля напрамак гэтага ланцугу, можна ўбачыць, што ён нідзе не адыходзіць ад мяжы больш, чым на 12—15 кілёмэтраў. На пра ягу 172 кілёмэтраў Рэйна ланцуг ідзе ўздоўж усяе ракі. Кожны з трынаццаці сталых праходаў і ўсе дзесяць іншых мажлівых праходаў між Сэльтцэм і Кэмбсом грунтоўна замкнёны і агароджаны. Такім чынам гэтым ланцугом агароджаны ад раптоўнага і нечаканага нападу ўсе ўваходы, якія вядуць у Францыю. І недарма піша Лёзан, што ўзмацаваньні з жалеза і бэтону, якія цягнуцца на трыста кілёмэтраў, нельга прарваць, як аркуш паперы. А калі нават каму-небудзь пашанцуе прарваць шчыліну ў якім-небудзь пункце, дык прыдзецца праціўніку значна пашырыць яе, каб уліць туды армейскую масу. А гэта, як мы бачым, ня лёгкая рэч.

* * *

Мы тут гаварылі пра невялікія казэматы. Ёсьць казэматы сярэдняга памеру, якія багата ўзброены кулямётамі і лёгкай артылерыяю. Ёсьць вялікія, тое, што завецца „ансамблем"—магутная група пабудоў, накшталт вялікага молу, які аб'ядвае ўмацаваньні, рэдуты, падземныя шляхі зносін. Маленькія казэматы падтрымліваюцца сярэднімі, а сярэднія—вялікімі. Маленькія даюць мажлівасьць люта супраціўляцца пяхоце. Сярэднія маюць больш матутны апарат абароны. А буйныя сваёй артылерыяй пакрываюць усё і могуць быць зьнішчаны толькі аграмаднымі сіламі. Вялікі ланцуг казэматаў—Гакенбэр перад Мэцам або Гохвальд у Вогэрах, у самым сэрцы славутых ліній Бісэмбургу, можа трымацца, як сапраўдная цытадэль.

Навіной зьяўляецца так званы „рухомы парк", фактычна цытадэль на колах. Парк мае ўвесь матэрыял, патрэбны для пабудовы лёгкіх умацаваньняў там, дзе гэтага патрабуюць абставіны, каб пракласьці лінію траншэяў, казэматаў для кулямётаў, матэрыял для драцяных загарод.

І ўся гэта вялізарная машына ваяўнічага французскага імпэрыялізму магутна ня толькі тым, што мае бязупынны прымежны ланцуг, але і тым, што часткі гэтай машыны надзвычай разнастайныя. Праглядзеўшы некалькі дзесяткаў казэматаў, Лёзан не пабачыў аднаго падобнага на другога. Тут казэмат літаральна схаваны пад зямлёй; там яго пабудавалі ў чыгуначным насыпе, далей—у грэблі, якая ідзе ўздоўж Рэйна.

У ніжнім Эльзасе Лёзан знайшоў казэмат паміж дрыгвы. Для таго, каб пабудаваць гэты казэмат, трэба было, як і пры пабудове мосту, пагрузіць кэсон у ваду на некалькі мэтраў, апаражніць кэсон і паставіць усярэдзіне бэтонны блёкгауз.

Кожны казэмат мае свой уласны плян і асобную конструкцыю. Гэта не стандартная вытворчасьць, а ўмелая індывідуальная работа.

Апрача казэматаў ёсьць спэцыяльная сэрыя складаў для прыпасаў харчу і г. д. Прывядзем апісаньне Лёзана складу перад Мэцам.

„... склад знаходзіцца ў невялікай гары. Уперадзе, на схіле гары ў бок мяжы, знаходзіцца невялічкае ўмацаваньне, якое складаецца з двух казэматаў і панцыраванай вежы для кулямётаў. Усё гэта зьвязана падземнай галярэяй даўжынёй у 130 мэтраў з казармай, выкапанай на супроцілеглым спадзе. Гэтая бэтонiраваная казарма мае два паверхі і можа зьмясьціць паўроты. Каб выканаць гэтую работу, прышлося вынуць ад 18 да 20 тысяч кубічных мэтраў зямлі. Выдаткавана на гэта некалькі мільёнаў.

Імпэрыялісты прагнуць крыві.

... Але найбольш дакладнымі складамі, бясспрэчна, зьяўляюцца склады вялікіх ансамбляў: там казармы будуць забясьпечаны электрычнай станцыяй, паветранымі і падземнымі чыгункамі, магутнымі вэнтылятарамі, багатымі складамі харчу і прыпасаў, цэлай сыстэмай каналізацыі...

Бязумоўна, што ва ўсёй сыстэме складаў казэматаў, рэдутаў, вежаў і іншага роду ўмацаваньняў прадугледжана ахова ад газаў, якія могуць быць пушчаны праціўнікам у бок умацаваньняў.

Але... Але, вось тут у самым канцы ёсьць невялічкае але... Нядарма нарысы Лёзана канчаюцца загалоўкам „Ланцуг вытрымлівае, калі..." калі ўвесь ён будзе абслугованы людзьмі, якім цалкам можа будзе даверыць ня толькі гарматы і кулямёты, але галоўным чынам, мэханізмы гэтых вялізарных пабудоў. Патрэбна армія мэханікаў, машыністаў, кавалёў з вялікай практыкай і багатай тэхнікай. Ці апраўдаюць яны давер'е—пытаецца Лёзан.

Электратэхнікі, рамонтныя рабочыя, радзісты, тэлефоністы, машыністы, кондуктары, чыгуначнікі, мэханікі,—што яны скажуць тады, як іх пасадзяць у гэтыя казэматы і загадаюць зьнішчаць?

Уявеце сабе сучасны флёт дрэдноўтаў, мінаносцаў, контрмінаносцаў, тралераў, падводных лодак, і што ўвесь гэты флёт, нярухомы ў мірны час на ўнутраным рэйдзе, ахоўваецца нязшматлікімі матросамі. Ці досыць будзе клікнуць: „Да зброі, грамадзяне!" і пагрузіць на борт капітанаў яхт, прымежных рыбакоў, каб прыдаць гэтаму флёту баяздольнасьць? Тое самае усім ланцугом казэматаў, пабудаваных уздоўж французскае мяжы.

Добра чырыкае Лёзан, пяючы славу французскаму мілітарызму. Добра будуць грукацець французскія гарматы і кулямёты з казэматаў. Птушкамі паымуцца французскія аэропляны, каб сеяць сьмерць у імя французскае бясьпечнасьці. Але апошні нарыс Лёзана выкрывае яго галоўныя клопаты і клопаты яго гаспадароў.

— А што скажуць масы?

Практыка французскага флёту ў Адэсе наводзіць Лёзана і яго гаспадароў на журботныя развагі.

— 13 мільёнаў рабочых і сялян забіты і пакалечаны ў мінулай апошняй вайне.

Тыл мілітарыстаў небясьпечны.

Дзікая машына зьнішчэньня, якую так маляўніча апісаў Стэфан Лёзан, мае, як і кій—два канцы.

Рабочая кляса паверне рулі гарматаў на капіталістаў каб, зьнішчыўшы капіталістычнае панаваньне выкарчаваць карэньні магчымасьці вайны.





КОЖНАМУ КОЛГАСУ РАЗЬЛІКОВУЮ КНІЖКУ

НА ФОТА-ЗДЫМКАХ:
КОЛГАСЬНІК РАЗГЛЯДАЕ РАЗЬЛІКОВУЮ КНІЖКУ.
ГУТАРАЦЬ ПРА ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ.
СІЛАСНЫЯ ВЕЖЫ.

ПІОНЭР ПРАВОДЗІЦЬ ПАДПІСКУ НА ПАЗЫКУ „ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ“.

ПІОНЭРКІ ВЕШАЮЦЬ ПЛЯКАТ.
РАБКОР АПУСЬЦІЎ ЛІСТ.
КОЛГАСЬНІК РЫХТУЕЦЦА ДА НАЧНОЙ ПРАЦЫ.

КОМУНА

Нарыс
ВАЛЕРЫЯ ШЭМПЕЛЯ

Ціха, павольна, гуляючы па гуцейскім двару, вецер падхопліваў сваімі далонямі раскіданыя невялічкія жменькі саломы і заносіў на дахі, пад якімі хаваліся высокія гуцейскія муры.

О, муры! У іх ёсьць шмат таемнага, і ведаюць яго толькі тыя, хто шмат год працуе за іх заслонай, хто выносіць усё сваё жыцьцё невялічкія кулі шкла. Чые кашулі былі размалёваны ад поту хрусталямі едкай солі.

А сёньня гэтага няма. Ні солі, ні поту няма. Андрэй Караташаў даў каштоўную прапанову, зрабіць калпак, і паставіць ўгары выцяжныя трубы. Сёньня гутнякі сьвяткуюць...

Гутнякі вясёлы і працавіты народ. Яны любяць працу і шкло — гэта іхняя золата, яны вырабляюць з яго ўсё, што можна. Ванная печ—гэта сэрца заводу. Гарачае сэрца ўсіх.

Андрэй Караташаў з шасьці год пайшоў працаваць на завод. Маці раніцай несла на руках Андрэйку на працу, і аддавала ў распараджэньне майстра. Працаваў ён восемнаццаць гадзін у дзень, атрымліваючы за гэта пяць капеек, але гэтаму рад быў Андрэйка. Маці бедная, бацькі няма. Пяць капеек і гэта кавалачак хлеба. Так да дзесяці год трымаў ён у майстра формы. Шмат нацярпеўся Андрэйка ад майстраў.

Бывала працуе ўначы, а спаць так хочацца, а ў сьпякоце самі зьліпаюцца вочы. Прыплюсьніць вочы, галавой стомленна кіўне і ў гэты момант па энэргіі сьцісьне абедзьве паловы формы адна да другой. А майстар паставіў шкло ў форму, каб выдуць графін ці гладыш. І сьцісьне Андрэйка разам з формамі шкло, і прапаў графін.

А майстру малая справа да таго, што Андрэйка хоча спаць, здыме трэп і хлусьціць ім па галаве.

Ой, шмат Андрэйка перанёс такіх удараў. Шмат разоў—майстра біў нагой яго ў зубы.

Трываў і плакаў.

Калі Андрэю было дванаццаць год, ён стаў баначнікам. Зарабляў крыху больш. Майстра сілком навучыў яго піць. Калі адмовішся, ён прагоніць ад сябе, ідзі, значыць, з ім. Андрэй хоць і хадзіў другі раз з майстрам к шынкарам, але гэты самагон быў для яго агідным, страшным. Другі раз нальле майстра ў кілішак самагону, а Андрэю робіцца жудасна ў гэты момант, па сьпіне невялічкімі кроплямі пальлецца пот, затрасе галавой Андрэй і скажа не...

Майстра сам паднімае кілішак, нальле ў рот Андрэю, а потым стукне кулаком у бок—пі, сукін, сын і закусвай хутчэй.

За васемнаццаць гадзін майстра выробляў 700 шклянак. Было горача і праз кожныя дзьве гадзіны ён павінен быў выпіць кілішак самагонкі. І ў канцы працы майстра адыходзіў ад варштату п'яны.

У гэтыя часы ён біў тады ўсіх сваіх падначаленых, бо адчуваў сябе невялічкім гаспадаром свайго варштату.

Гэта было...

На двары на невялічкім грудку цаглін сядзіць Андрэй. Ён адпачывае захоплены музыкай ветрагону, які гнаў вецер на прасы. Сядзіць Андрэй і думае. Шмат думае... Успамінае ён даўнейшую працу, бацьку, маці. Успомніў, як праходзілі дзіцячыя гады... Яшчэ больш сумней стала.

— Што я бачыў?..

А моладасьць пралятае, зараз дваццаць пяць. Толькі я цяпер і жыву...

— А раней?..

Нейкая невядомая сіла сьціснула грудзі... Паплылі перад вачмі агідныя малюнкі былой пакуты... І ў гэтым задуменьні, нечакана над галавой яго прагучэў жаночы голас.

— Ну вось табе і радактар, ды яшчэ шматтыражкі. Там назьбіралася шмат матэрыялу, патрэбна апрацаваць і аддаць у друкарню, а ты сядзіш тут...

— А які матэрыял?—запытаўся Андрэй.

Алеся, весела сьмяючыся, адказала...

— Аб пераходзе на гаспадарчы разьлік, зьмена „Комунар" хоча раней зрабіць гэта. Зьмена імя „Сталіна" высунула сустрэчны прамфінплян. Ну, што табе, мала?

— Добры матэрыял.

— Добры, але ідзем са мной, — настойліва патрабавала Алеся,—апрача гэтага, цябе сакратар партколектыву кліча да сябе.

— Ну, пойдзем!

* * *

Назаўтра прызначаны сход рабкораў, вывешаны па цахох аб'явы. Старшыні цэхавых насьценгазэт паабяцалі Андрэю, што рабкоры зьявяцца на сход, як адзін. Сваёй шчырай адданасьці да рабкораўскага руху і жвавасьці ў сваёй працы Андрэй надумаўся організаць рабкораўскую комуну. Не адкладваючы гэту справу надалей, Андрэй абмеркаваў гэта пытаньне з сакратаром партколектыву і шмат з якімі рабкорамі.

Усе згодны і віншуюць Андрэеву думку. На сходзе аднагалосна прайшло пытаньне аб організацыі рабкораўскай комуны. Організавалі адну комуну ў зьмене „Кастрычнік" і ў шліфавальным цэху. Адміністрацыя пайшла насустрач. Перакінулі з аднаго варштата на другі варштат рабкораў, і ўтварылі адзін варштат рабкораўскай комуны.

На трэці дзень комуны былі разам і прыступілі да працы. Першы дзень гутаўская комуна, на чале якой стаяў Андрэй, абагнала ўсе варштаты па вырабе шклянак. Замест 1.800 зрабілі 2.000. Так працавалі некалькі дзён. Нарэшце, Андрэева комуна высунула сустрэчную лічбу прамфінпляну —замест 1.800 і 2.000, 2.300 шклянак вырабляць за пяць з паловай гадзін і зьнізіць сабекошт на 40 проц.

Першы час рабочыя глядзелі на Андрэевы прапановы з насьмешкай...

— Глядзі ты на яго... Знайшоўся такі герой выпрацаваць за пяць з паловай гадзін 2.300 шклянак. Мы раней працавалі па васемнаццаць гадзін і выраблялі па 700 шклянак, а ён 2.300.

— Ха-ха-ха, сьмейцеся з яго старыя людзі, чалавек з розуму зышоў!—Сьмяяўся з яго стары майстра Вінцэк Пятроўскі.

Падышоў стары прагульшчык, Антось Ветражыцкі, што ўвесь час ня злазіць з чорнай дошкі.

— У чым справа?

— Аб комуне спрачаецеся?

— Ну і дурні з вас дурні, чалавеку закруціла ў галаве, а вы спрачаецеся. Паглядзім, а потым будзем гаварыць... Тады мы будзем пісаць на р. р. р. аб... кор...р...р...скую... ком. м...муну,— расьцягваючы гаварыў Антось.

Злосна глядзеў Андрэй на іхні сьмех і на іхнюю іронію. А калі злосьць трохі адышла, ён павярнуўся да Ветражыцкага і сказаў:

— Хутка пабачыш, як патрэбна працаваць!..

З гэтымі словамі ён цавярнуўся да вышаў на вуліцу.

У часе працы комуна працавала з захапленьнем, абганяючы астатніх.

Сьпявалі песьні, але яны не перашкаджалі ў працы, а, наадварот, паднімалі яшчэ большы настрой.

Адносчыкі насілі шклянкі асьцярожна ў апечак для апалу. Вілкі заўсёды былі роўныя і канцы крыху былі загнутыя і заўсёды гарачыя, каб ня лопалі шклянкі ад халодных вілак.

Комуны ўзяты на сябе абавязак выконвалі. Пасьля працы майстры падыходзілі да Андрэя, гаварылі аб працы. Дзівіліся, чаму ў іх бой, а ў комуне няма. Андрэй радаваўся, што майстры трымаюць комуну ў пашане ў апошні час і адказываў на кожнае пытаньне. Палюбілі Андрэя майстры за яго працу. Бывала праходзіць Андрэй цераз гуту і чуе—які-небудзь мастра шэпча другому...

— Працавіты хлапец...

— І ўмее працаваць, а таксама і другому паказаць і растлумачыць...

* * *

Майстры назаўтра сьпяшаліся папасьці ў пераборню раней Андрэя. Іх цікавіла, колькі комуна зрабіла, каб ведаць раней Андрэя, а потым пажартаваць крыху з ім. Паглядзець у талён у пераборні, а потым чакаюць Андрэя на двары. А калі паяўляўся Андрэй у браме заводу; яны яго заўсёды сустракал жартамі.

— Ты ведаеш, Андрэй, мы цябе абагналі,—сьмяяўся з яго стары мастра Казлоўскі.—Ня можа быць—сьмяяўся Андрэй. І тут Казлоўскі, хлопаючы Андрэя на плячы, гаворыць—не, не ты наперадзе ўсіх... Бачыш, мы так ня можам спрытна працаваць, мы ўжо старыя. А вы—маладое!..

Радуецца Андрэева сэрца, яшчэ мацней стукае, не адстаючы ад тактаў ветрагону, лязгату жалезных трубак. Прышоўшы ў пераборчую, Антось Ветражыцкі таксама да іх, глянуў на Андрэя, вочы заблішчэлі.

— Ведаеш, Андрэй, вазьмі мяне ў комуну, будзем разам, працаваць.

— Не... Пачакай брат,—сьмяецца Андрэй.—Во я комуны, а не мая. Я адзін прыняць не магу.

Казлоўскі, сьмяючыся з Ветражыцкага, прыпомніў яму, як раней ён сьмяяўся з Андрэя А цяпер у комуну просіцца, каб прынялі.

— Але нічога прыняць можна, за апошні час ён справіўся, гледзячы на працу рабкораўскай комуны...

* * *

Ужо вечарэла..

Андрэй Караташаў, Ветражыцкі і Казлоўскі выходзілі сьмяючыся на вуліцу. На вуліцы было ціха, летні вечар не ўскалэне ніводнага лістка на гальлі старых ліпаў. Толькі ў гуце бачыш, як мігаюць агні, чуеш гутарку майстраў аб комуне.

А далей ужо выбухае звонкая маладая песьня і нясецца некуды далёка-далёка за ноч, за прысады, за палі...

У барацьбе за беларускі Донбас

100% выкананьня пляну



НА ЗДЫМКАХ: РОЗНЫЯ МОМАНТЫ ПРАЦЫ

СЕЎ СКОНЧАНЫ

Нарыс
СЯРГЕЯ МУРЗО

ПАД шырокія вокны цэху падыходзіць вечар, кажа: „зьмена першая, працу канчай—ідзі на адпачынак" Вечар, а ня верыцца—пяць гадзін, гэта альбо машыністы рана гудок даў.

На некалькі хвілін для агляду дынам станкі прыпынілі бег, рамяні скрыпнулі напружна, сталі... А ў калідоры ўжо зьвіняць галасы другой зьмены. Замурзаныя рабочыя сьпяшаюцца на сход, бо сёньня вельмі важнае пытаньне—інфармацыя падшэфнага калгасу аб выніках вясны—другой бальшавіцкай. Плечыцца радасьць жыцьцёвая ў грудзёх у заводзкай моладзі. Дзень рабочых хлопцаў: сход заўкому, ячэйкі, вытворчая нарада. На крэслах селі больш пажылыя, а моладзь на вокнах.

Сход адчынены. Калектыўная гаворка змоўкла, калгасьнік інфармаваў: „сеў у асноўным скончаны, але з-за недахопу рабсілы ў пасадцы бульбы мы маем некаторы прарыў. Таварышы, вы бачылі барацьбу з кулацтвам у часе стварэньня калгасу. Зараз усім відавочна, што мы ідзем да сацыялізму".

— Адпрацаваць заўтрашні выхадны.

— Скончыць пасадку бульбы—адказала ўся заля.

Заўтра а восьмай быць у колгасе, вынес пастанову сход.

Рабочыя выходзілі з заводзкага клюбу, вецер прыганяў у твар сьвежы сочны водар зялёнага лісьця.

***

Спалоханыя чарвякі ўзварушыліся на здобнай мяккай зямлі. Зямля парэзаная на вялізныя кавалкі хлеба прыкрывала пасаджаную бульбу. Пякло сонца. У першых лічбах маю дзе-ні-дзе яшчэ бялеў сьнег. Раптоўна рвануўшымся цягнікам прыімчалася вясна, завіла зялёныя кудры дрэвам. Сукновыя зорныя бязмежжы абсыпала зялёнай травой. Як умовіцся з вясной. Глядзіш і травень на носе. Патрэбна многа рук. Шырокія палі аруць, людзі ходзяць, згінаючы сьпіны быццам шукаюць нешта. Здалёк каля нейкага будынку яны здаюцца падобнымі да чырвонаармейцаў. Рухаюцца рытмічна ў правы бок нібы практыкуюцца са стрэльбамі. Гэта брыгады ўскідваюць гной на калёсы. Адзін за другім цягнуцца вазы, гной раскідваюць на полі, ад яго сьцелецца на доле бялявы туман. З брыгадамі заводзкімі побач калгасьнікі. Спаборніцтва ідзе з суседнім калгасам таму і ніводнай мінуты прагулу няма. На днях вынікі—хто першым скончыць сеў. А над палямі на ўзгорку гнуцца тонкія вяршыны хвой. Часам жахлівым голасам пракрычыць лес і перад вачыма паўстаюць часы панаваньня белапалякаў. Хвоі дапамагаюць успамінаць старому майстру мінулае далёкае. А колькі неразгаданых быляй ведаюць сосны? Сёньня спакойнай гаворкай яны апавядаюць пра гэрояў заводаў і палёў.

***

У калгасе звонкі ўдар у чыгунны брусок замяняе сырэну. Усе здаюць інвэнтар, коняй адвозяць і ідуць да рэчкі мыцца. На траву сядаюць маленькія крыштальныя вадзяныя кропкі падобныя на падшыпнікавыя шарыкі. Сонца закацілася і на небе засталася чырвоная гушчыня воблакаў. Нейкія невядомыя гукі праносяцца ў маўклівы прастор. Ледзь чутныя, яны нагадваюць глухое шастаньне вады і говар у лазьні. Калі яны прыбоям рэчных хваляў даходзяць да вуха, раскацістыя гукі гэтыя нішто іншае, як гул заводаў і стон цягнікоў.. Лямпачкі над калгаснай хатай склалі літары:

КЛЮБ

Пры нязгушчонай яшчэ цемры чырвоныя хусткі і кашулі нагадваюць кляновае восенскае лісьце. Пад тонкае трэнканьне балалайкі крыкнулі частушкі. Іх больш усяго любяць кальгасьнікі: яны і мілагучны і прымітыўны. У гэтай песьні простым словам больш скажаш.

Калгасьнікі і завадзкія абвясцілі сход і ганарова сялянамі было сказана:

— Сеў другой бальшавіцкай скончаны

Брыгада шэфаў у сярэднім падала 2 *га* ўзаранай і засаджанай зямлі.

У позьні час вышлі ў горад, разразаючы тулавам чорную тлустую ноч.

Трактары і ноччу спакою ня маюць—трашчаць, трашчаць...

Развітваючыся, сяляне гаварылі:

„І ночы для працы не хапае ў такія гады".

ЗА ПРАЦАЙ ФОТО-ЭЦЮД



ФІЗКУЛЬТУРА РАБОЧЫМ   СТАДЫЁН. Г. МЕНСК.

Поэзія

Валеры Маракоў.

* * *

Горад грыміць і грыміць.
Вуліца проста да славы...
Грузка паўсталі дамы—
Постаць высокае справы.

Стаў я адзін на рагу.
Слухаю музыку руху.
Гулка трамваі бягуць,
Брэшуць аўтобусы глуха.

Ў нашай краіне вясна.
(Дадзена права на сонца!),
Й ты не адзін ля старна,
Гэткіх, як ты, бясконца.

Сам ты адчуеш зямлю—
(Поступ шырокага траўню),
Сам ты ім скажаш—люблю
Гэткіх і любых і слаўных.

Мне-бы стаяць і грымець
Ў грохаце вуліц, у натоўпе!
Мне-бы сьмяяцца з агіднага—сьмерць,
Што пралятае ў Эўропе.

Чую я гукі сырэн—
Гэта наступнага поступ,
Гэта інакшы Шопэн,
Творца высокага росту...

Будзем-жа славіць жыцьцё,
(Творчую песьню прыбою);
Будземісьці па касьцёх,
Тых, што памерлі бяз бою...

Будзем, як волаты мы—
Нашае права за намі...
Горад жыве і грыміць,
Камень кладзецца на камень...

Масква.

* * *

Стаю прад Пушкіным адзін
І думу думаю сувора.
Тут кожны камень мне гаворыць
Пра дні вялікіх пуцявін.

Я знаю, Пушкін,—вы поэт
І вашай музай акрылён я...
Вы лепшай славы лепшы цьвет
Ад Місісіпі і да Дону.

Ваш грозны шлях прывёў ў туман,
(І гэта заўжды нам знаёма).
Вам апяваць-бы новы стан
Больш і упарцей, чым другому.

Вы першы з першых. Вашу кроў,
Што дагарала ў дзікім сьнезе,
Завем мы песеннай зарой,
Сатканай з сонечных поэзій!

Прад вамі й я схіляюсь ніц
І гавару ў натоўпе вуліц,
Што вы з мэталю і зарніц
І мы па-свойму вас адчулі...

Мы знаем, Пушкін,—вы поэт
І ваша слова—меч крылаты...
Вы лепшай славы лепшы цьвет
І гэтай славай мы багаты.

Масква.

Алесь Пруднікаў.

ПАСТУХ ТАМАШ.

Ля алешніку,
Ля вадапою,
Дзе травы—аксамітны шоўк,—
Думамі перапоўнены
Ён стругае кіёк
Нажом.
Тонкарунных пасе авечак,
Адкідаючы поглядам сьціплым...
А яны—
Па расе расквечанай
Маладую атаву шчыплюць...
Не па сіле, здаецца, яму-б
За такімі віхрастымі бегаць;
Ёсьць у дзеда
Сабака—Амур.
Без якога старому нельга.
Абвіецца Амур ля ног,
І прыгожы такі,
і любы...
Ліжа ён у барадзе ільняной
Языком тамашовы губы.
А калі за кустамі шум
Нанясе у табун перапуду—
Тамаша неахутвае жудзь,
Бо з Амурам,
Спакойным будзеш.
Помніць дзед, як у гэтых кустах
'Шчэ з дзяцінства,
'Шчэ нават змалку—
Пастушком у паноў падрастаў
Пад пагрозай дубовае палкі.
Так было
З Тамашом калісь...
Па каменьнях хадзіў ён босым
І зайздросьціў жыцьцю калін,
І зайздросьціў жыцьцю бярозак.
Бо калі пакрываўся луг
Саваном беласьнежнай зімы—
У каршэнь выганяў,—
У імглу
Пастуха свайго пан—
Грамык.
Многа сьлёз
На зямлю пралілося,
З-пад павекаў
Набраклых яго...
Шапацелі сузор'і калосьсем
Усьміхаючыся на загон.
Пад навесамі мокрых пунь
Начаваў адзінокі Тамаш...
Злосьць кіпела,
І помсты пульс,
Цішыню парушаў і туман...
... А цяпер—
Пастухом у колгасе,
Боль мінулы ў душы патух...
Пажартуе калі:
—Я уласьнік
Над усімі авечкамі тут!
І як сонца з блакітнай высі
За дуброваю ціха ляжа,—
Дзед, з Амурам,
Як месяц, лысы,
Гоніць сытых авечак з пашы.
Нават ноччу,
Калі засьне,
Сны старому прыгожыя сьняцца:
—Па атаве густой, як сьнег—
Белыя скрозь—
Ягняткі...
А за імі Амур бяжыць,
Лапы закідваючы квола...
. . . .
Ах, ты шыр... Лугавая шыр...,
Тонкарунных авечак
Воўна...

Юлі Таўбін.

(З кнігі вершаў „Экзамен“)

Мой добры.
мой даўні
мэнтар,
настаўнік
мае хады—
Вечар з глухім акцэнтам,
вечар сіняй вады.
Ішлі мы з табою—поруч,—
і лёгка-ж было ісьці,
трымаючыся
за поручы
над шчылінамі цясьнін.
Няхай
вымаўленьне
дзікае
Твае дзівіла натоўп,
А ты
выпраўляў
мне дыкцыю,
І ты
задаваў мне тон.
Задумлівы
і патайны,
З нявыказанай
журбой...
Мой добры,
стары настаўнік,
Разыходзімся
мы з табой.
На сьлядох тваіх вырас плюшнік,
Дзікі неруш шчытом парос,
На павеках тваіх
нерасплюшчаных
Стынуць кроплі сьвітальных рос.
Цішэюць
твае крокі
У змроках пуцявін.
Шляхі мае
шырокія
Праходжу сам—адзін.
Калі
якому ў ахвоту
Хай
сочыць думы мае—
Калі
я даў сабе воту,
Я выканаю
яе.
Ня цьвіў я ніколі
бросьняй
І песьняй
ня гучэў, не.
Адна ў мяне толькі просьба,—
Каб веры далі мне
Калі ёсьць на сьвеце мэты,
Дык і я знайду свой бівак,
Калі быў у мяне мэнтар—
Я сказаў яму
„бывай“.

17/I—1931 г.



НА ПАБУДОВЕ ФОТО-ЭЦЮД

РАБОЧЫЯ - УДАРНІКІ НАГАРОДЖАНЫЯ ОРДЭНАМ Ул. І. ЛЕНІНА

Фэдзін—рабочы сьлесар.

Т. Рэзьнікава.

Трэшкевіч—брыгадзір брыгады пайкі.

ГІШПАНІЯ НА РАЗДАРОЖЖЫ

Нарыс М. КАЛЬТОФЭНА.

Гішпанская рэволюцыя ўступіла ў рашаючы этап. Нізрынуцьце монархіі, у якім вялізарныя масы працоўных змагаліся за свае ўласныя інтарэсы, было толькі прэлюдыяй. Пытаньне, на якім спатыкнулася монархія і спатыкнецца хоць які буржуазны ўрад, гэта пытаньне вырашэньня аграрнай проблемы. Шэсьцьдзесят сем процантаў усёй зямлі знаходзіцца ў руках нешматлікіх буйных зямляўласьнікаў, больш за ўсё ў руках каталіцкай царквы. Паасобныя ўладаньні (латыфундыі) дасягаюць да 15.000 *га* і часам яшчэ больш. Толькі на нямногіх з іх гаспадараць самі ўласьнікі. Паводле старой фэўдальнай сыстэмы для атрыманьня зямельнай рэнты маёнткі аддаюцца ў арэнду. Рэнта высокая і павялічваецца з урадлівасьцю зямлі так, што арандатар ніколі ня можа нават аплаціць затрачанай працы. Нярэдка маёнткі агулам перадаюцца прамежкавым арандатарам, якія ў сваю чаргу перадаюць зямлю зноў у арэнду. Гэты мэтод здачы зямлі ў арэнду павялічвае арэндную плату.

Маленькая карыкатура з дробнай каталанцкай вясковай газэты кідае пробліск на цяжкі стан сялянства: уласьнік, толькі што атрымаўшы рэнту, адыходзіць у задавальненьні з поўным мяшком на плячох, а селянін з сваёй сям'ёй застаюцца па пустым полі. „Ідыёт, ён-жа ўзяў $^2/_3$ усяго ўраджаю!" Жонка заспакойвае яго: „успакойся, ты толькі падумай—у Андалузіі яны-ж забіраюць усё!"

Такое сапраўднае становішча сялянства. Чаго не забярэ ўласьнік, тое праглынае падатак. Аб сельскагаспадарчых прыладах павінен турбавацца сам арандатар, само сабою зразумела, што пры яго цяжкім становішчы ён ня мае сродкаў для палепшаньня сельскагаспадарчых прылад і дзеля гэтага карыстаецца вельмі застарэлымі. Штучныя ўгнаеньні, напрыклад, ня ўжываюцца. Дрэнна выраблямая глеба не дае таго, што магла-б даць пры параўнаўча добрым гаспадараньні.

Вялікая частка зямлі наогул пустуе, бо адсутнічаюць сродкі да яе вырабу. З 45 млн. *га* прыдатнае для сельскае гаспадаркі зямлі апрацоўваецца толькі 20 млн *га*, а астатнія знаходзяцца пад пашай. Зямляўласьнікі ані ня турбуюцца аб скарыстаньні зямлі і зацікаўлены толькі ў атрыманьні рэнты.

І хай пасьля доўгай бясконцай шматгадовай працы арандатар прымусіць прыроду да паслухмянства, зямлю да ўрадлівасьці, як прыходзіць паведамленьне аб высяленьні. Здаецца з першага погляду вельмі соцыялістычны закон гарантуе арандатару пасьля пэўнага раду год зямлю ў яго ўласнасьць, але на вялікі жаль да закону „забыліся" зрабіць заўвагу, якая-б забараняла памешчыку рабіць высяленьне арандатара, і ў рэчаіснасьці гэты закон хутчэй толькі шкодзіць арандатару. Апошні аднаго дня раптам траціць свой вучастак, будучы беззваротна выгнаным і павялічвае армію галоднага вясковага пролетарыяту.

Становішча амаль двух мільёнаў гішпанскіх дробных зям..яўласьнікаў зьяўляецца нялепшым. Мізэрныя зямляўладаньні, часта па 1 *га* зямлі, перагружаны падаткамі і запазычанасьцю. Дробны селянін пакутвае ад тых-жа цяжкасьцяй, што і арандатары. І гэтаму віною ня толькі стыхійныя беды, якіх не ахіліць ніякай прадбачлівасьцю, але і цяжкасьці са збытам. Прадажныя цэны на сельскагаспадарчыя продукты вельмі нізкія, пры параўнаўча высокіх цэнах на тавары. Віною гэтаму нездавальняючыя транспортныя ўмовы. У 1923 г. працяглась..ь чыгунак складала 16.000 *км*, што дае на 1 *кв. км* плошчы толькі 0.003 *км* чыгункі. На кожныя 100 жыхароў па 0.7 *км*. (У даваеннай Расіі на 100 жыхароў прыпадала па 1,6 *км*!). Транспарт дзеля гэтага каштуе дорага, продукты роўнамерна не разьмяркоўваюцца па краіне; ва ўзьбярэжных і прыгранічных мясцовасьцях замежныя продукты, ня гледзячы на высокія мытныя пошліны, каштуюць таней за ўнутраныя. Дробныя сяляне, дзяржавай і царквою да апошняга высмактаныя, чарадамі пакідаюць свае ўладаньні. На працягу ўжо некалькіх год, дзяржава мізэрнымі мерапрыемствамі спрабуе спыніць уцяканьне сялян, але гэта не дае ніякіх вынікаў. Вясковы пролетарыят такім чынам атрымлівае бесьперапыннае папаўненьне з асяродзьдзя дробнага сялянства.

Вясковы пролетарыят, гэты найбяднейшы і найчасьцей за ўсё найбольш эксплёатуемы слой Гішпаніі, складаў у 1929 г. тры з чвэрткай мільёны. (Індустрыяльны пролетарыят ледзь налічвае ўсяго 1.750.000 чалавек). Умовы работы сельскагаспадарчых рабочых найгоршыя. За цяжкую работу выплачваецца ад 2 да 4,5 пэзэт на дзень, прычым да гэтага трэба далучыць пэрыодычнае беспрацоўе ў сувязі са спыненьнем у пэўных частках году палявых работ. Агулам кожны сельскагаспадарчы рабочы „сьвяткуе" ў год 101 дзень, шмат хто „сьвяткуе" нават да 200 дзён штогод! Сельскагаспадарчая камера провінцыі Сэвіля налічыла толькі ў сваім раёне 50.000 беспрацоўных сельскагаспадарчых рабочых: чатыры больш аддаленыя провінцыі налічылі 100.000 „сьвяткуючых". У 1930 г. больш 27.000 чалавек з прычыны беспрацоўя пакінула г. Лёрца (79.000 жыхароў). Праз увесь час то тут, то там успыхваюць паўстаньні, якія душацца ў струменях крыві. Стары ўрад аж да самага свайго нізрынуцьця не дапамог, адраблаючыся толькі галаслоўнымі абяцанкамі.

Зусім зразумела, што ня гледзячы на няпісьменнасьць (Гішпанія мае 65 проц. няпісьменных, інакш кажучы стопроцантная няпісьменнасьць на вёсцы!),—ня гледзячы на неразуменьне і няяснасьць сваіх задач, вясковы пролетарыят рука ў руку з роспачлівымі арандатарамі і дробным сялянствам, складаў рэволюцыйныя масы пры нізрынуцьці старога ўраду. Пры бязьмежным зямельным голадзе нацыяналізацыя зямель буйных зямляўласьнікаў была першым патрабаваньнем.

Інстынктыўна ўтвараліся вясковыя рады, як у Сарагосе і іншых мясцох, якія былі падобны да рускіх Саветаў. Рэспубліканскі ўрад, як і папярэдні каралеўскі, ужывае гвалт. Таксама і ён непахісна стаў на глебу прыватнае ўласнасьці, у той час як толькі неадкладная нацыяналізацыя зямель буйных уласьнікаў была адзіным выйсьцем. Перад усё узрастаючым абурэньнем сударжна шукае новы ўрад компромісаў. Міністр замежных спраў Лерусь ніжэйзьмешчанай заявай дае магчымасьць зразумець палітыку новага ўраду.

„Я не разумею, чаму буйныя зямляўласьнікі супраціўляюцца нацыяналізацыі іх маёнткаў, калі даходы застаюцца ім як і даўней".

Значыцца думаюць правесьці нацыяналізацыю выкупам—што інакш кажучы роўна непасільнаму абцяжараньню сельскагаспадарчых рабочых і сялянскіх мас.

Спачуваньне ўраду асобам, якія мелі ўладу пры каралі, заўважаецца з першага погляду ва ўсіх галінах жыцьця. Ня толькі ўчынкі, як дапушчэньне ад'езду караля, без таго, каб прымусіць яго да адрачэньня, як незаарыштаваньне былога дыктатара Бэрэнгера, які праз дзень пасьля выбараў плянаваў новы дзяржаўны пераварот; як прызначэньне Аунара, старшыню апошняга каралеўскага габінэту, галоўнакамандуючым флётам! Прычына для гэтага ёсьць—страх буржуазіі перад пролетарыятам. Хаця прамысловасьць яшчэ і ня разьвіта, хоць спосабы работы зусім застарэлі, хоць дзеля беднасьці шырокіх слаёў насельніцтва ўнутраны рынак зусім нязначны, але ўсё-ж такі стварыўся, праўда не шматлікі па колькасьці, але моцны па рэволюцыйнай клясавай сьвядомасьці, пролетарыят, які паўстае супроць мізэрнай аплаты і цяжкіх умоў работы. Гэты індустрыяльны пролетарыят, пазадзі якога стаіць абуджаючаяся сялянства і масы сельскагаспадарчых рабочых, патрабуе больш, як буржуазнай рэспублікі. Хоць у большасьці індустрыяльныя рабочыя і знаходзяцца, з прычыны неразьвітых вытворчых узаемаадносін, яшчэ пад анарха-сындыкаліцкім кіраўніцтвам, аднак на працягу апошніх год комуністы атрымліваюць усё большы ўплыў. На апошніх выбарах упяршыню ў прамысловых акругах былі выстаўлены і выбраны комуністы. Індустрыяльны пролетарыят сёньня натхнёны духам змаганьня. З усіх індустрыяльных цэнтраў атрымліваюцца паведамленьні аб вулічных баёх паміж рабочымі і „рэспубліканскімі" вайсковымі. У Сэвіліі ўжытыя пяхотныя палкі перайшлі на бок дэмонстрантаў.

Буржуазная рэспубліка ахоплена палітычным жахам. Страх перад пролетарскай рэволюцыяй штурхае яе да саюзу з тымі, хто меў уладу раней. Гэтаму спрыяюць таксама і далейшыя супярэчнасьці, як, напрыклад, колёніяльнае пытаньне ў Мароко, у разьвязаньні якога народныя масы зьяўляюцца заўзятымі супраціўнікамі. Яшчэ так сьвежы ўспаміны аб пэрыодычных стратах крывёю і грашыма. Проблема нацыянальных маемасьцяй таксама пераблыталася ў клубок неразьвязальных супярэчнасьцяй. Каталанцы, баскі і інш. патрабуюць самавызначэньня. Каталанія абвясьціла сябе незалежнай рэспублікай. Толькі фэдэрацыйныя штаты могуць здавальняюча і поўна разьвязаць гэта балючае пытаньне.

Супярэчнасьці навочна павялічваюцца і абвастраюцца; толькі адно на сёньня застаецца непахісным і ясным, гэта тое, што рэспубліканскі ўрад ня зможа іх разьвязаць.

Гішпанія знаходзіцца толькі ў пачатку рэволюцыі. Сёньнейшыя рэволюцыйныя падзеі зьяўляюцца толькі пролёгам да Гішпанскай пролетарскай рэволюцыі.

Пераклад А. Б.

ЖЫЦЦЁПІС МІЛЬЁНАЎ



Т. Падольскі.



Падвеснае тачыла Т. Падольскага.

Нарыс Л. БАРЫСАЎСКАГА.

У ЛЕТАПІСАХ гісторыі чалавецтва няма конкрэтных і практычных інструкцый па соцыялістычным будаўніцтве, бо раней гэткага будаўніцтва ня было і не магло быць. Пабудова соцыялізму ёсьць ад пачатку і да канца справай рабочае клясы, якая пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі змагаецца і дамажацца свайго ўласнага вызваленьня. І ў процэсе соцыялістычнага будаўніцтва рабочая кляса знаходзіць у сабе патрэбныя сілы для вырашэньня гэтае ўсясьветна-гістарычнае задачы. Рабочая кляса стварае колектыў соцыялістычных працаўнікоў, каб дамагчыся пастаўленае мэты. Імя гэтых работнікаў—легіён. Усе яны па-свойму легендарныя, баячныя, бо гісторыя чалавецтва яшчэ падобнага ня бачыла. Але ёсьць у кожным героі нешта такое, што вылучае яго з сотні тысяч яму падобных і пра гэта мы хочам тут расказаць.

* * *

— Нам патрэбны свае савецкага вырабу трактары—быў загад „Чырвонаму Пуцілаўцу".

Свае трактары—гэтыя словы гучаць вельмі горда. Да рэволюцыі ў нас пра трактары і ня марылі. Пасьля рэволюцыі мы выдаткоўвалі сотні тысяч валюты на закупкі замежных трактараў для нашага соцыялістычнага земляробства. І партыя загадала: апанаваць гэтым тэхнічным узвышшам—даць свае трактары.

Інжынэры тэхнічнай камісіі, якія выпрацоўвалі проект трактарнага цэху, глыбока ня ўдумлівалі ў гэтую справу. Інжынэр Іваноў лёгка працягнуў свой шкодніцкі проект. Дарма даводзіў інжынэр Тэр-Асатураў усю шкоднасьць проекту Іванова. Пяцігадовы інжынэрскі стаж Тэр-Асатурава быў пераможаны у камісіі багатай практыкай і соліднасьцю Іванова.

Проект Іванова быў ухвалены.

Тэр-Асатураў паехаў у Амэрыку для разьмяшчэньня заказаў на абсталяваньне. І, калі Асатураў пабачыў патрэбныя варштаты, ён яшчэ больш пераканаўся ў тым, што яго проект мае рацыю.

Профіль варштатаў не супадаў з профілем карпуў. Каб памясьціць варштаты ў корпус, прышлося-б ламаць сьцены новапабудаванага гмаху.

Тэр-Асатураў з двума маладымі савецкімі інжынэрамі на чужыне, у Амэрыцы, узяўся за перапроектоўку, нанова перарабляецца ўвесь тэхнолёгічны процэс, нанова плянуецца корпус, адны варштаты змяняюцца іншымі. У працягу дзесяці месяцаў тры інжынэры і ўдзень і ўначы працавалі над новымі проектамі.

Адказная пабудова была выратавана.

Тады шкоднікі рашылі даць бой па лініі тэмпаў. Бачачы, што іх проект праваліўся, яны высунулі другі плян—даць у 1930 г. 10.000 трактараў, сабраных з імпортных дэталяў.

Тады партыйны колектыў заводу на чале са сваім адказным сакратаром т. Алексеевым высунуў свой сустрэчны плян—20.000 трактараў з савецкіх дэталяў.

Завод дамогся перамогі і з'эканоміў $2^1/_2$ мільёны залатых рублёў.

Пролетарская дзяржава ўзнагародзіла т. т. Тэр-Асатурава і Аляксеева вышэйшай узнагародай—ордэнам Леніна.

А такіх ня мала. Мы-б маглі расказаць пра маладога комсамольца Мірошнічэнка Янку, які яшчэ зусім нядаўна кінуў піянэрскі атрад, якому ўсяго толькі 20 год, але які пасьпеў ужо сваёй работай зьдзівіць увесь сьвет, перад якім спасавала ўзброеная да зубоў капіталістычная тэхніка.

У канцы 1932 г. чыгункі СССР перавязуць рознага роду грузаў больш чым $4^1/_2$ разы ў параўнаньні з даваенным часам. і больш чым у $2^1/_2$ разы ў 1930 г. У гэтым самым годзе работа транспорту па перавозцы пасажыраў дасягае ста мільярдаў пасажыра-кілёмэтраў. Што азначае гэты факт? Іронія, фантазія? Так. Гэта стаіць на мяжы фантазіі, але для капіталістычнага сьвету. І іх заняпад, а ў нас вялізарны рост, які бязупынна павялічваецца ўсё больш і больш.

Але для гэткіх тэмпаў перавозак наш транспорт вымагае грунтоўнага тэхнічнага пераўзбраеньня. Дык, вось, адну з вельмі адказных частак тэхнічнай рэволюцыі па транспорце складае аўтоматычнае счапленьне вагонаў. Увесь транспорт амэрыканскіх чыгунак быў ужо ў 1910 годзе абсталяваны аўтоматычным счапленьнем. У нас гэтага зусім ня было. Але аніводная з існуючых амэрыканскіх сыстэм аўтоматычнага счапленьня не адпавядае ўсім тэхнічным запатрабаваньням і нас яны задаволіць ня могуць. Вось чаму быў абвешчаны ўсесаюзны конкурс на проект лепшага аўташчапленьня.

Сын растоўскага Ленінскага паравоза-будаўнічага заводу Іван Мірошнічэнка, які ўжо чатыры гады на заводзе, і пасьнеў ужо зрабіць некалькі машын, узяўся за вырашэньне гэтае проблемы. Пасьля работы на заводзе, юнак вывучае тэхнічную літаратуру. Нешта малюе ў сваім блёк-ноце, запісвае. Вечарамі ён малюе эскізы, вылічае, параўноўвае розната роду варыянты.

Шмат рознага роду варыянтаў аўтаматычнага счапленьня запрапанаваў Мірошнічэнка. А калі спэцыяльная камісія азнаёмілася з яго проектамі, дык яна знайшла, што проект Мірошнічэнкі мае багатыя перавагі перад усімі існуючымі формамі аўтаматычнага счапленьня, у тым ліку і перад найлепшымі ў сьвеце вузорамі амэрыканца Вільлісона.

Паслухайце пра комсамольскую брыгаду заводу імя Лейсэ, ўзнагароджанай ордэнам Леніна.

Гэты завод сваю пяцігодку выканаў у $2^1/_2$ гады. Ён мае прэмію УсеЦСПС, сьцяг рабочых Дэйтронта і пераходны сьцяг МСНГ. Шмат якія з сваіх дасягненьняў завод мае дзякуючы ўдарнай брыгадзе комсамолак абматальнага цэху.

Брыгада арганізавалася ў красавіку 1929 г. З недавер'ем сустрэў цэх пачын комсамолак. Але дзяўчата мала зьвярталі на гэта ўвагі.

— Вельмі спадабалася нам,— апавядае адна брыгадзірша,— што ўсе, як адзін, падцягнуліся адразу ў рабоце, больш шчыльна пачалі мы адчуваць адзін аднаго ля варштатаў. Я адказваю за яе дрэнны мотор. Яна за мой хвалюецца. Спачатку нат дзіўна было.

Брыгада адразу ўзьняла дысцыпліну, якасьць, продукцыйнасьць працы. Спрабавалі падцягнуць увесь цэх за сабой, але сустрэлі пры гэтым няпрыхільную ўпартасьць некаторых старых работніц. Былі выпадкі, што брыгадзе падкідвалі брак, псавалі інструмант. Шмат крыўды перацярпелі комсамолкі ў першыя дні існаваньня брыгады, але адступіць і ня думалі. Перш усяго яны рацыяналізавалі сваю працу. Усе работніцы цэху дагэтуль матаюць цалкам абезьвэ шпулькі мотора. Ударніцы падзялялі гэты процэс на дзьве опэрацыі: адна работніца матае ніжэйшую шпульку, другая—вышэйшую. Ударніцы дабраахвотна зьнізілі расцэнку. Летась на—17 проц., сёлета на—23 проц.

Брыгада вядзе за сабой увесь цэх. За ёй падцягваюцца і астатнія. За май брыгада перавыканала плян на 30 рухавікоў.

— Мы,—кажуць ударніцы,—сваю пяцігодку ў $2^1/_2$ гады выканалі, а ў астатні час нашу адну выканаем.

— Факт,—нібы ў адказ пацьвярджаюць ударніцы.

Па ўсіх заводах, на ўсіх фабрыках вялікага Савецкага Саюзу раскінуты сотні і тысячы рабочых, якія працай сваёй ажыцьцяўляюць словы Леніна, што „комунізм пачынаецца там, дзе зьяўляецца самаахвярная, перамагаючая цяжкую працу турбота радавых рабочых аб павялічэньні продукцыйнасьці працы, аб ахове кожнага пуда хлеба, вугалю, жалеза і іншых продуктаў, якія дастаюцца не працуючым асабіста і ня іх „сваяком", а „дальнім", г. зн. усёй грамадзе ў цэлым, дзесяткам і сотням мільёнаў людзей, аб'яднаных спачатку ў адну соцыялістычную дзяржаву, потым у Саюз савецкіх рэспублік.

Вось характарная біографія аднаго са шматлікіх будаўнікоў новае соцыялістычнае грамады.



т. Падольскі за шліфавальным станком.

Касімаў Арс-Халі. Кіргіз. Яму 18 год. Да 1929 г. ён быў пастухом у кіргіскіх стэпах. Батрачыў з дзесяці год. Бацька яго забіты дэнікінцамі, матка памерла.

16-гадовы Арс-Халі тры дні ішоў стэпам і прышоў да чыгункі. Ён прыехаў у Сталінград. Праз два дні міліцыя, як беспрытульнага, даставіла яго ў дзіцячы дом.

Арс-Халі ў колектыве ўцягваецца ў працоўнае жыцьцё. Хлопцы чытаюць, пішуць, але Арс-Халі нічога не разумее, і яму таксама ахвота вучыцца.

— Хочу вучыцца,—кажа ён,—па-расійску не разумею, а пакіргіску—тут школы няма.

У дзіцячым доме яго вучаць працаваць на трактары, а потым адкамандыроўваюць працаваць на трактарны волат.

Тут ён пабачыў вялізарныя машыны, гучлівае заводзкае жыцьцё, аграмадныя цэхі Трактарнага.

Сёньня Арс-Халі—адзін з лепшых ударнікаў малога конвэеру. Як пачалося змаганьне за пяцітысячны трактар, Арс-Халі працаваў па 12 гадзін у дзень. Ні на водную хвіліну ня пакідаў свайго месца на конвэеры, пакуль ня сайшоў трактар № 5000. І тады... тады Арс-Халі напісаў заяву, што ён замацоўвае сябе на Трактарным да канца пяцігодкі.

Так перарабляе завод чалавека, так перарабляе чалавек завод.

Бо калі ў працягу 19 гадзін домна Макееўскага заводу ніяк не хацела вярнуць тапленьне сталі, увесь цэх хадзіў нібы шалёны. Астатнія пяць мартэнаў за гэты час ужо два разы выдавалі тапленьне, асьвятляючы цэх халодным блакітным зьзяньнем густога сталёвага вару і фэярычным дажджом іскраў.

Трэцяя зьмена мітусілася, ля шостай домны, як людзі каля ложку цяжарнай жанчыны, якая ніяк ня можа абрадзіцца. Сталевар, ужо страціў усякую здольнасьць.

Неадчэпна аслупянела стаяў ён ля домны, усё разглядаючы, ў маленькае вакенца, але нічога ён ужо больш ня бачыў. Прыходзілі інжынэры, тэхнікі, майстры, кожны па доктарску даваў свой рэцэпт, падсыпаў парашкоў, узьнімаў тэмпэратуру, але нічога не дапамагала. Сталь заставалася ў домне, якой пагражала вялізарная небясьпека.

І калі віда вочна наплывала небясьпека на некалькі сотняў тысяч рублёў дзяржаўнай маемасьці, рашылі паслаць за праўленьнем, справа зайшла ўжо занадта далёка: баяліся сапсуць гмах-печку.

Член праўленьня прыбег у цэх. Сухі, рухлявы, пачарнелы, падобны на цыгана, ён спыніўся ля домны, заглядаючы ёй у вочы. Яны глядзелі адзін на аднаго, падзеленыя тонкай пласьцінкай сіняга шкла. Доўга глядзець ня было калі. Ён спытаўся аб тым, якія сродкі выпрабаваны, а пасьля пачаў аб нечым шаптацца з інжынэрам. Відаць было, што інжынэр катэгорычна супроць прапанову члену праўленьня. Усё толькі чулі апошнія інжынэравы словы.

— Але за домну вы адказваеце...

Член праўленьня дзейнічаў, як усьмірыцель. Перад ім была ня хворая, а ашалелая, непакорная печка. Яе нядаўна рамантавалі—якія-ж тут хваробы? Ён працаваў па-свойму. Ён рызыкнуў.

Яго спакой перадаўся астатнім. Спарней пашла і ў тых работа. Мянялі тэмпэратуру, больш нормальна круцілі колы рэгулятара газу. Праз гадзіну перад членам праўленьня была ўжо пакорная, паслухмяная печка, якая яшчэ праз паўгадзіны выдала гатовую звычайную сталь, якая таплася там амаль суткі.

Усьмірыцель сталі, член ураду, член Украінскага цэнтральнага выканаўчага камітэту, майстра мартэнаўскага цэху Макеўскага заводу Рэзьнікаў замасоленым рукавом выцірае пот, які ручаінамі ліўся з яго твару.

А калі дырэктыва партыі гаворыць, што СССР павінен зрабіцца мэталічным, дык на мове тон, гэта азначае, што СССР павінен даць у 1932 г. 17 мільёнаў тон чыгуна.

Гэтыя мільёны тон захапілі Рэзьнікава цалкам. Ён думае аб адным, як-бы павялічыць продукцыйнасьць працы сваёй домны, як гэта прымусіць яе, каб замест трох топак у суткі дала чатыры. Гэта значыць адразу даць на 33 проц. выпрацоўкі больш, чым яна давала раней.

Рэзьнікаў не лятуценьнік. Мэталюргія яшчэ не навука.—кажуць інжынэры,—мэталюргія—мастацтва. Дык вось таму, напакор усім інжынэрам Рэзьнікаў хоча даць 4 топкі. Рэзьнікаў вылічае на хвіліны ўсе процэсы работы. Для яго не аўтарытэт, што сталь павінна тапіцца 7—8 гадзін, а гэта значыць, што больш трох топак у суткі ня выпусьціш. Ён паскарае ўсе процэсы работы і першы ў паўднёвай мэталюргіі на старых мартэнаўскіх печах, Рэзьнікаў даў чатыры топкі.

Перамагла бальшавіцкая ўпартасьць, самаахвярная адданасьць справе пабудовы соцыялізму ў СССР.

Рэзьнікаў—гонар усяго заводу, атрымаў ордэн Леніна.

Пашана і слава такім рабочым. Цэх—фронт, дзе перамога дасягаецца націскам, гэроізмам, моцнай дысцыплінай, ясным дакладным плянам. Для гэтага фронту патрэбны энтузыясты, будаўнікі, для якіх соцыялізм гэта жыцьцё, соцыялістычнае будаўніцтва справа ўласнае крыві і мазгоў. Гэткія людзі загартоўваюцца зараз на шматлікіх рыштаваньнях будоўлі соцыялізма ў СССР.

Краіна павінна ведаць сваіх герояў, каб у іх вучыцца і браць з іх прыклад.

Выданьне БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА. Адказны рэдактар МІХАСЬ ЧАРОТ.

Вышлі з друку

Платон Галавач

СПАЛОХ на ЗАГОНАХ

АПОВЕСЬЦЬ

179 стар. Цана 75 к.

Пятро Броўка

ЦЭХАВЫЯ БУДНІ

ПАЭЗІЯ

55 стар. Цана 60 к.

Зьмітрок Бядуля

ЯЗЭП КРУШЫНСКІ

РАМАН

Другое выданьне 416 стар. Цана 2 р. 30 к.

С. Грыгор'еў

БЭРКА КАНТОНІСТ

241 стар. Цана 1 руб.

Мікола Хведаровіч

ТЭМПЫ— КАНТРАСТЫ

110 стар. Цана 1 р. 25 к.

Мікола Багданаў

ПЕРШАЯ ДЗЯЎЧЫНА

135 стар. Цана 1 р.

Іоган Бэхэр

ЛЬЮІЗІТ

391 стар. Цана 1 р. 75 к.

Васіль Сташэўскі

КОЙДАНАЎСКАЯ МТС

46 стар. Цана 15 кап.

Міхась Багун

РЭХА БУР

ВЕРШЫ

78 стар. Цана 75 к.

Барыс Мікуліч

УДАР

Апавяданьне

110 стар. Цана 70 к.

Цана 20 кап.

1279

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА на 1931

на адзіны ў БССР ілюстраваны двухтыднёвы часопіс тыпу лепшых ілюстраваных часопісаў СССР

Чырвоная Беларусь

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ МІХАСЯ ЧАРОТА

У „Чырвонай Беларусі" на працягу 1931 г. будуць зьмешчаны:

Апавяданьні: Аралава, З. Бядулі, С. Баранавых, Іл. Барашкі, Вольнага, Тараса Гушчы, Цішкі Гартнага, Платона Галавача, Даўгапольскага, Міхася Зарэцкага, Ізбаха, Васіля Каваля, Элі Кагана, Р. Кальтофэн, М. Кальтофэн, М. Лынькова, Ліманоўскага, Р. Мурашкі, Маўра, М. Нікановіча, Нёманскага, Кузьмы Чорнага, Міхася Чарота і інш.

Поэмы і вершы: А. Александровіча, Астапенкі, Янкі Бобрыка, П. Броўкі, М. Багуна, Алеся Звонака, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Крапівы, Максіма Лужаніна, Валерыя Маракова, І. Плаўніка, Юлія Таўбіна, Ізі Харыка, Ул. Хадыкі, М. Хведаровіча, Міхася Чарота, С. Шушкевіча і інш.

Нарысы і фэльетоны: Бяліны-Падгаецкага, Бэндэ, Вольнага, Яўгена Жука, Цімоха Зарэчнага, Клімчука, Мікуліча, Васіля Сташэўскага, Шкадарэвіча, Хв. Шынклера.

Малюнкі і фото: Ахрэмчыка, Азгура, Бразэра, Булычова, Вал. Волкава, Давідовіча, Кіпніса, Барыса Малкіна, Мазэлева, Ул. Семянякі, Салавейчыка, М. Філіповіча і цэлага шэрагу раённых корэспондэнтаў.

УСЯГО „ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ" ДАЕ Ў ГОД:

звыш 1000 фотаздымкаў, якія ілюструюць соцыялістычнае будаўніцтва СССР і БССР, а таксама замежнае жыцьцё, звыш 300 малюнкаў лепшых мастакоў, звыш 200 апавяданьняў, вершаў і нарысаў.

„Чырвоная Беларусь" будзе высьвятляць:

самыя шырокія праявы жыцьця, рэконструкцыйнага пэрыоду і магутнага наступу па ўсяму фронту вёскі, соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, змаганьне за пяцігодку ў чатыры гады, колектывізацыю сельскай гаспадаркі і інш.

Умовы падпіскі:

На 1 год		На 6 мес.		На 3 мес.	
р.	к.	р.	к.	р.	к.
3	—	1	50	—	75

Асобны нумар каштуе **15 к.**

Падпіска прымаецца: усімі кнігарнямі, кіёскамі і ўпаўнаважанымі БДВ, усімі пашт.-тэлеграфнымі канторамі і крамамі спажыв. коопэрацыі.

Тэлефон рэдакцыі 17-09

Бібліятэка БССР

Друкарня імя Сталіна   Зак. № 1528. 12380 12.700 экз.   Галоўлітбел № 1031

204135